ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 26 (997) 25 чэрвеня 2011 г. Кошт 1500 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА



С. 4 — 5

С. 10

С. 8

С. 15

ЗАПРОШАНЫМ НА БАЛЬ...

БЫЧЬЦЕ

С. 2

Фота Юрыя ІВАНОВА

Напрыканцы чэрвеня ў Палацы Рэспублікі лепшых з лепшых традыцыйна збірае Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў. Сярод іх і тыя, хто скончыў ВНУ сферы культуры. Некаторых з іх, запрошаных на баль, вы бачыце на здымку...

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

"Шлях да Перамогі пачынаўся адсюль"

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка вечарам 22 чэрвеня ў Мемарыяльным комплексе “Брэсцкая крэпасць — герой” прыняў удзел у памятных мерапрыемствах, прысвечаных 70-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Пра гэта паведамілі ў Прэс-службе беларускага Лідара.

Кіраўнік дзяржавы ўсклаў вянок да скульптурнай кампазіцыі “Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй у неўміручасць зрабілі крок”, што адкрылася ў Брэсцкай крэпасці. Да п’едэстала кампазіцыі таксама леглі кветкі ад ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікоў пагранічных ведамстваў краін СНД, Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў баявыя сцягі воінскім часцям пагранслужбы Беларусі, пасля чаго сустрэўся з ветэранамі. Ён таксама наведаў Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор, дзе запаліў свечку ў памяць аб ахвярах вайны.

Выступаючы перад пачаткам канцэрта-рэквіема майстроў мастацтваў Беларусі і Расіі, які прайшоў на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што для беларускай дзяржаўнасці спадчына герояў з’яўляецца краевугольным каменем, і беларусы не дапусцяць рэвізіі вынікаў мінулай вайны. “Мы будзем заўсёды выхоўваць нашу моладзь на прыкладах павагі да слаўнага мінулага, гуманізму, патрыятызму і чалавекалюбства. Мы ніколі не станем іванамі без роду і племені, якія не памятаюць усіх, хто пакутаваў, змагаўся і перамог”, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Глыбока сімвалічна, на яго думку, што памятныя мерапрыемствы, прысвечаныя 70-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны, праходзяць у Брэсцкай крэпасці. “Не толькі таму, што тут пачалася вайна. Але і дзеля таго, каб яшчэ раз нагадаць усім: шлях да Вялікай Перамогі пачынаўся адсюль! Ад гэтых старых сцен, дзе плавіўся камень, але цвярдзелі сэрцы”, — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

“Дарагую цану заплаціла Беларусь за Перамогу і за Свабоду. У той жудаснай вайне загінула, скалечана трэць нашага насельніцтва. Была поўнасцю разбурана эканоміка, разгромлены і разрабаваны культурны здабытак народа. Беларусь сцерлі з карты планеты”, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Аднак беларусы не скарыліся агрэсару. “Калі настаў час выпрабаванняў, нашы мірныя людзі — мужчыны, жанчыны, нават дзеці — прадэманстравалі ўсяму свету ўзоры мужнасці, стойкасці і патрыятызму. Мы тады здзейснілі другі подзвіг — працоўны, аднавіўшы з руін і попелу нашу зямлю. Усё гэта называецца “беларускі характар”, — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што беларусы заўсёды будуць удзячныя пакаленням, якія прынялі на сябе страшны ўдар вайны, але не схілілі галовы і не сталі на калені. “Ветэраны ў нашай краіне акружаны пашанай і дзяржаўным клопатам. Яны — наша духоўная апора, аснова грамадзянскай супольнасці”, — падкрэсліў беларускі Лідар.

“Мы не аддадзім забыццю нашы брацкія магілы, масавыя пахаванні, нашы мемарыялы — ад грандыёзнай у сваім трагізме Хатыні да магілы невядомага салдата”, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, увекавечанне памяці аб Подзвігу абаронцаў Айчыны з’яўляецца справай агульнанацыянальнага значэння. Увасабленнем удзячнасці пакаленню пераможцаў стане найбуйнейшы ў Еўропе новы Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які ўзводзіцца ў горадзе-героі Мінску. “Сёння мы адкрываем манумент у гонар абаронцаў граніцы і членаў іх сем’яў, якія падзялілі лёс сваіх мужоў і бацькоў”, — адзначыў Прэзідэнт, выказаўшы шчырую ўдзячнасць пагранічнікам рэспублік былога Саюза, што таксама прынялі ўдзел у стварэнні гэтага манумента.

Пасля выступлення Кіраўнік дзяржавы ўручыў дырэктару Мемарыяла, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны і ваеннаслужачаму пагранічнай службы Беларусі памятны меч, выраблены Златавустаўскай зброевай кампаніяй для Брэсцкай крэпасці-героя. Гэты памятны меч прысвячаецца Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і сімвалізуе нязломны дух, з’яднанасць і гераізм савецкага народа.

Пасля Кіраўнік дзяржавы прайшоў у глядзельную залу для прагляду канцэрта-рэквіема. Пасля заканчэння яго ўдзельнікам быў паднесены кош кветак ад імя Прэзідэнта Беларусі.

Паводле паведамленняў Прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

На здымку: Аляксандр Лукашэнка каля скульптурнай кампазіцыі “Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй у неўміручасць зрабілі крок”.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

За некалькі дзён да балю...

Па традыцыі, Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў краіны праходзіць напрыканцы чэрвеня. І выпускнікі, што становяцца яго ўдзельнікамі, заўжды з нецярпеннем чакаюць сустрэчы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам.

А выпускнікі ВНУ культуры і мастацтва напярэдадні сустрэнуцца і з міністрам культуры краіны Паўлам Латушкам.

— Сустрэча з міністрам адбудзецца ў Нацыянальным мастацкім музеі, — паведамляе карэспандэнту “К” начальнік аддзела навучальных устаноў і працы з творчай моладдзю Міністэрства культуры Алена Рыбчынская. — Сёлетні выпуск прыпаў на год, адзначаны важнымі датамі: 120-годдзем з дня нараджэння Максіма Багдановіча і працягам святкавання юбілею мастака Івана Хруцкага. Павел Латушка, як мяркуецца, пазнаёміцца і паразмаўляе з адзінаццаццю выпускнікамі вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва ў вядучым музеі краіны…

Рыхтуючы здымак для першай паласы, за колькі дзён да падзеі мы сустрэліся з некаторымі выпускнікамі нашых творчых ВНУ. Прыгожыя і ўпэўненыя ў сабе, усе яны маюць дакладныя планы на будучыню, якімі і падзяліліся з карэспандэнтам “К”.

— Я збіраюся весці актыўнае творчае і навуковае жыццё, — адзначае выпускніца факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (спецыяльнасць “мастацкі тэкстыль”) Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Вераніка Багачова. — Паступаю ў магістратуру, пасля — у аспірантуру, але ўвесь час буду займацца ўласнай творчасцю. Мне здаецца, што выкладчыцкая дзейнасць будзе спрыяць майму развіццю як творцы, і наадварот. А запрашэнне на Рэспубліканскі баль было для мяне вельмі нечаканым, я нават і не марыла пра гэта! Мне па жыцці не так ужо і патрэбен стымул, каб працаваць у любімай сферы, але гэта выдатная ўзнагарода за стараннe…

Выпускнік факультэта народных інструментаў (баян) Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Уладзіслаў Плігаўка зазначыў, што запрашэнне стварыла для яго святочную атмасферу:

— Ад кожнай ВНУ на баль трапляюць усяго некалькі чалавек, і для мяне вялікі гонар, што я стаў адным з іх. Гэта будзе стымул для творчага росту. Дадам, што таксама паступаю ў магістратуру, і ўжо з’яўляюся салістам Белдзяржфілармоніі. Я лічу, што прафесійнае музычнае мастацтва вельмі важнае для развіцця як асабістых якасцей чалавека, так і грамадства. Калі яно высокага ўзроўню, то і краіну ведаюць ды паважаюць за мяжой. Я стаўлю сабе за мэту папулярызаваць наша мастацтва ў розных краінах свету, рабіць так, каб яно было там прадстаўлена, каб яго пазнавалі…

А выпускніцы розных факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Іна Галаванёва, Настасся Пуцевіч, Настасся Бікбаева, Улада Цімафеева і Кацярына Беразнёва запэўнілі, што ўсе збіраюцца працаваць па спецыяльнасці — і не толькі ў час адпрацоўкі размеркавання. Што ж, у добры шлях!

А рэжысёрам Рэспубліканскага балю выпускнікоў з’яўляецца Улада Арцюкоўская. Гэтымі днямі маладыя людзі ўдзельнічаюць у рэпетыцыях да свята, якое абяцае быць цікавым і непаўторным.

...Мы пагутарылі з выпускнікамі ВНУ сферы культуры ў той час, як рабілася фота для першай паласы. Дарэчы, шчыра дзякуем за дапамогу ў арганізацыі здымак дырэктару прадпрыемства “Мінгарсвятло” Славаміру Рыневічу, а таксама машыністу аўтавышкі АГП-17 Уладзіміру Запекіну.

Алена САБАЛЕЎСКАЯ

На здымку 1-й паласы: Уладзіслаў Плігаўка ў атачэнні чароўных выпускніц-2011 Веранікі Багачовай, Іны Галаванёвай, Настассі Пуцевіч, Настассі Бікбаевай, Улады Цімафеевай, Кацярыны Беразнёвай, Наталлі Табушавай.

Мы дамовіліся сустрэцца з тымі выпускнікамі ВНУ сферы культуры, якія былі запрошаны на Рэспубліканскі баль, каля Нацыянальнага мастацкага музея. Так атрымалася, што акурат у той самы час адтуль выйшлі таксама выпускнікі, але — Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча імя А.Глебава. І ўжо — з дыпломамі! На ўрачыстасцях у музеі іх павіншавалі начальнік аддзела навучальных устаноў і па рабоце з творчай моладдзю Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Алена Рыбчынская, старшыня Мінскага гаркама Беларускага прафсаюза работнікаў культуры Віктар Маліноўскі, дырэктар НММ Уладзімір Пракапцоў, народны мастак Беларусі Георгій Паплаўскі...

Фота Юрыя ІВАНОВА

Павіншуем Рэспубліку!

Канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі, прымеркаваны да Дня Незалежнасці краіны, 1 ліпеня збярэ ў Палацы Рэспублікі самыя знакавыя прафесійныя і аматарскія калектывы ды вядомых выканаўцаў. Пра гэта паведаміла карэспандэнту “К” рэжысёр свята Ніна Осіпава.

Беларускі дзяржаўны ансамбль “Песняры”, Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль “Харошкі”, Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь, Ірына Дарафеева ды шмат маладых выканаўцаў прапануюць гледачам свае лепшыя нумары. Ніна Осіпава адзначае, што яны выканаюць і зводныя кампазіцыі, сустрэўшыся на адной сцэне.

— У канцэрце будуць выкарыстаны элементы тэатралізацыі, камп’ютарнай графікі, відэа, — дадае рэжысёр. — Але ўсіх сакрэтаў пакуль расказваць не будзем, паколькі хочам здзівіць гледачоў...

Напярэдадні Дня Незалежнасці запланавана ўрачыстая цырымонія ўскладання вянкоў да помніка Перамогі. А 3 ліпеня жыхары і госці сталіцы змогуць пабачыць парад ваеннай тэхнікі ды зводнай роты ганаровай варты і зводнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, а таксама іншых удзельнікаў. Пра гэтыя планы на святочныя дні паведамляе ўпраўленне культуры Мінгарвыканкама.

Парад прадоўжыць тэатралізаванае спартыўна-маладзёжнае шэсце, а цягам дня будуць праходзіць выстаўкі-продажы, пленэры, канцэртныя праграмы ў кожным з раёнаў сталіцы.

С.К.

Музейная мадэрнізацыя

У межах пятага пасяджэння шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны аднагалосна быў адобраны праект Закону “Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”.

Як адзначыў у сваім выступленні міністр культуры нашай краіны Павел Латушка, неабходнасць змяненняў у законапраект выклікана практыкай выкарыстання гэтага дакумента, а таксама зменамі, што адбыліся ў айчынным заканадаўстве. Пры гэтым, па словах міністра, праект Закону быў падрыхтаваны з улікам усіх заўваг, якія былі выказаны пад час падрыхтоўкі дакумента.

У прыватнасці, былі ўнесены змяненні ў азначэнні некаторых тэрмінаў, у тым ліку — “музей”, “музейная калекцыя”, “музейная справа”. Гэта, на думку Паўла Латушкі, дазволіць больш дакладна вызначыць віды дзейнасці, якія з’яўляюцца абавязковымі для кожнага музея. У якасці асноўнага кірунку дзяржаўнай палітыкі ў музейнай сферы, акрамя забеспячэння захаванасці Музейнага фонду, названа і забеспячэнне рэжымаў захоўвання фондаў. Упершыню заканадаўча замацоўваюцца асновы дзейнасці музеяў пад адкрытым небам, а таксама прапануюцца новыя падыходы ў рэгуляванні пытанняў міжнароднага супрацоўніцтва. У сувязі з гэтым, у законе прадугледжаны ўмовы, пры якіх Міністэрства культуры краіны ў выпадку арганізацыі міжнароднай выстаўкі ў Беларусі выдае гарантыйныя абавязацельствы аб захаванасці і своечасовым вяртанні музейных прадметаў, што ўвозяцца ў краіну.

У праекце Закону маецца і шэраг новаўвядзенняў. У прыватнасці, упершыню вызначаны статус і кампетэнцыя Рэспубліканскай рады дырэктараў музеяў пры Міністэрстве культуры, што дазволіць скаардынаваць і ўдасканаліць супрацоўніцтва між музеямі, у тым ліку замежнымі. Таксама ўпершыню замацоўваецца Палажэнне аб стварэнні рэестра музеяў з мэтай арганізацыі іх уліку і фарміравання адзінай базы даных. Пэўныя змяненні ўнесены і ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб нематэрыяльнай культурнай спадчыны, ратыфікаванай нашай краінай у 2004 годзе.

На думку міністра культура, змяненні, унесеныя ў артыкулы законапраекта, якія рэгулююць дзейнасць Дзяржкаталога Музейнага фонду, у тым ліку ўвядзенне катэгорыі асабліва каштоўных прадметаў, дазволяць у кароткія тэрміны завяршыць работу па яго стварэнні і ўвесці ў навуковы абарот сапраўды скарбы культуры.

Па словах Старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Антаніны Моравай, законапраект адпавядае Канстытуцыі краіны і будзе спрыяць далейшаму развіццю музейнай справы ў нашай краіне, патрыятычнаму выхаванню насельніцтва, а таксама ўмацаванню пазітыўнага іміджа нашай краіны.

Міжгаліновы падыход

Новым крокам у папулярызацыі беларускай культуры на міжнароднай арэне і супрацоўніцтве ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны стала далучэнне нашай краіны да рэгіянальнай праграмы Савета Еўропы “Кіеўская ініцыятыва”.

Праграма, пагадненне аб стварэнні якой было дасягнута ў 2005 годзе ў сталіцы Украіны, аб’ядноўвае мерапрыемствы, што праводзяцца Саветам Еўропы. У прыватнасці, удзельнікамі праграмы ўлічваецца вопыт ужо рэалізаваных праектаў у сферы заканадаўчых рэформ, паляпшэння аховы муніцыпалітэтамі гістарычных мясцін, супрацоўніцтва з гарадамі з мэтай развіцця культурнага турызму. Адна з мэт праграмы — аказанне садзейнічання ва ўстойлівым культурным, сацыяльным і эканамічным развіцці пры дапамозе шматбаковага супрацоўніцтва і міжгаліновага падыходу ў пытаннях аховы культуры і культурнай спадчыны.

Як паведамілі “К” у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, у Камітэце міністраў Савета Еўропы прайшла ялцінская канферэнцыя пад назвай “Кіеўская ініцыятыва” і “Усходняе партнёрства” — супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне”, па выніках якой краінамі-ўдзельніцамі была адобрана Ялцінская дэкларацыя. Удзельнікі канферэнцыі аднадушна прынялі рашэнне аб уключэнні Беларусі ў рэгіянальную праграму Савета Еўропы “Кіеўская ініцыятыва” і выказалі жаданне актывізаваць партнёрства з Еўрапейскім саюзам у сферы культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны краін — членаў “Кіеўскай ініцыятывы”.

Старт рэгіянальнай праграме быў дадзены ў 2006 годзе ў час пасяджэння міністраў культуры Савета Еўропы ў Бухарэсце. Арганізатарамі праекта выступілі Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова і Украіна.

Ул. інф.

Форум медыя і прафесіяналаў

Рэзалюцыю VI Беларускага міжнароднага медыяфоруму “Партнёрства ў імя будучыні: патрыятызм, духоўнасць, яднанне” прынялі ўчора яго ўдзельнікі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Дакумент мае на мэце данесці асноўныя тэзісы форуму да шырокай грамадскасці. Як паведамілі карэспандэнту “К” у сектары знешніх сувязей упраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязей Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, на пленарным пасяджэнні медыяфоруму, вынікам якога стала рэзалюцыя, прысутнічалі 500 кіраўнікоў і журналістаў айчынных і замежных сродкаў масавай інфармацыі, экспертаў. Практычна ўсе госці з 21 краіны свету, што падалі заяўкі на ўдзел у форуме, прыехалі і актыўна ўдзельнічалі ў дыскусіях, майстар-класах.

Увага журналістаў была скіравана на такія актуальныя тэмы, як “Рэспубліка Беларусь у кантэксце сучасных геапалітычных працэсаў”, “Цывілізацыйнае адзінства як аснова суверэннага развіцця дзяржаў Садружнасці”. Удзельнікі дыскусіі выказалі свае меркаванні і на тэму “Новая роля сродкаў масавай інфармацыі ў фарміраванні палітычных рэалій”.

Дарэчы, намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч пад час брыфінгу напярэдадні медыяфоруму зазначыла: “СМІ павінны быць адказныя за лёсы сваіх народаў, яны могуць увайсці ў гісторыю краін, у якіх дзейнічаюць. І кожны сродак масавай інфармацыі нашай дзяржавы павінен выпрацаваць стратэгічную лінію паводзін у новых умовах”.

Летняя школа журналістыкі ў рамках медыяфоруму адбылася 23 чэрвеня ў Інстытуце журналістыкі БДУ. У яе адкрыцці прынялі ўдзел міністр інфармацыі краіны Алег Праляскоўскі, дырэктар Інстытута Сяргей Дубовік і прэзідэнт Еўразійскай акадэміі тэлебачання і радыё Валерый Рузін. Апошні правёў для студэнтаў майстар-клас на тэму “Сацыяльная адказнасць СМІ ў сучасных умовах”.

Майстар-клас на тэму “Культура і сродкі масавай інфармацыі” прадставіла прэзідэнт Рускага клуба мастацтва і культуры Наталля Галіцына. Шмат цікавых дакладаў, што закраналі пытанні працы калумністаў, фотакарэспандэнтаў, сеткавых СМІ, інфармацыйных агенцтваў ды іншых, з цікавасцю слухалі і каменціравалі студэнты Інстытута журналістыкі.

Сёння ж удзельнікі VI Беларускага міжнароднага медыяфоруму наведаюць Замкавы комплекс “Мір” і Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, дзе бліжэй пазнаёмяцца з культурай і гісторыяй нашай краіны.

Сябры, у Александрыю!

6 ліпеня ў вёсцы Александрыя, што на Шклоўшчыне, пройдуць купальскія ўрачыстасці як складнік традыцыйнага Рэспубліканскага свята “Александрыя збірае сяброў”.

Начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Сінкавец паведаміў “К”, што ў Купаллі прыме ўдзел уся творчая Магілёўшчына, і не толькі…

Да ўдзелу ў свяце прыцягваюцца вядучыя майстры беларускай эстрады, а таксама творчыя калектывы падняпроўскіх рэгіёнаў Расіі, Украіны, Беларусі. Справа ў тым, што гала-канцэрт мае дэвіз “Купалле над Дняпром”.

Свята адкрыецца канцэртам аматарскіх калектываў і выканаўцаў, што перамаглі ў абласным конкурсе мастацкай творчасці аграгарадкоў. Кожны раён Магілёўшчыны будзе прэзентаваць свой творчы падворак. А агульнае, міжнацыянальнае “Купалле над Дняпром” сатчэцца з рэгіянальных абрадавых элементаў Беларусі, Расіі і Украіны.

Наш кар.

На здымках: лазернае шоў і кірмаш рамеснікаў у час леташняга свята ў Александрыі.

Класікі загучаць на хіндзі

У Мінску адбылася рабочая сустрэча міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Маноджа Кумара Бхараці.

Як паведамляе Міністэрства культуры краіны, у ходзе перамоў з Паслом Індыі, які ініцыяваў сустрэчу, былі абмеркаваны пытанні двухбаковага беларуска-індыйскага супрацоўніцтва.

У прыватнасці, разгледжаны пытанні аб падрыхтоўцы Праграмы супрацоўніцтва паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Індыя ў галіне культуры, мастацтва, адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі і друку на 2011 — 2013 гады, якая плануецца да падпісання пад час правядзення пасяджэння міжурадавай беларуска-індыйскай камісіі ў верасні бягучага года, аб магчымасцях арганізацыі Пасольствам Індыі ў Беларусі шэрагу мерапрыемстваў ва ўстановах культуры, аб рэалізацыі праектаў па ўзаемным перакладзе літаратурных твораў вядомых аўтараў абедзвюх краін, аб магчымасцях вывучэння хіндзі ў вышэйшых навучальных установах Беларусі. Індыйскім бокам выказана гатоўнасць аказаць садзейнічанне Міністэрству культуры нашай краіны ў выданні на хіндзі твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа да 130-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры ў 2012-м.

Асаблівая ўвага была нададзена пытанням двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі. Дасягнута дамоўленасць аб магчымым прыездзе ў Беларусь індыйскіх кінапрадзюсараў для абмеркавання пытанняў супрацоўніцтва ў згаданай сферы. Суразмоўцы таксама абмеркавалі магчымасці выкарыстання індыйскім бокам кінатэхналагічных паслуг і студыйных магчымасцей Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”.

Як паведамілі карэспандэнту “К” у Дэпартаменце па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, індыйскі бок выказаў зацікаўленасць у здымках сваіх стужак на тэрыторыі нашай краіны. Таксама ішла гаворка аб перспектыве арганізацыі стажыровак айчынных кінематаграфістаў і студэнтаў факультэта экранных мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на кінастудыях і ў навучальных установах Індыі, двухбаковым супрацоўніцтве ў сферы сумеснай кінавытворчасці і ўдзеле індыйскіх кінематаграфістаў у кінафестывалі “Лістапад”. Чакаецца, што індыйская карціна будзе заяўлена ў конкурснай праграме Мінскага міжнароднага фестывалю.

Цукеркавыя "вузельчыкі"

Сёння ў Івянцы распачаўся “Цукеркавы фэст”, які другі год запар ладзіць адно з буйных кандытарскіх прадпрыемстваў. Вось ён, крэатыў, што зыходзіць з прыватнай ініцыятывы!

Здзівіліся, калі даведаліся, што на кандытарскім прадпрыемстве ёсць пасада… вядучага спецыяліста па этнаграфіі. Гэты спецыяліст — Антаніна Хатэнка. Яна і прыдумала Цукеркавы фэст.

“Мы — партнёры”, — кажа мастацкі кіраўнік Івянецкага гарпасялковага дома культуры Таццяна Аляшэвіч. Паводле яе слоў, установа сустракае гасцей (а пад час фэсту ў гістарычным цэнтры Івянца яблыку няма куды ўпасці), дапамагае гукаўзмацняльнай апаратурай. Адзін з партнёраў “цукеркавай дзеі” — і Івянецкі музей традыцыйнай культуры, што мае абласное падпарадкаванне. Кіраўнік установы Віктар Загавалка паведамляе “К”, што фэст разгортваецца на іхняй тэрыторыі — на сядзібе вайсковага афіцэра Пятра Драгунцава, які пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай атрымаў зямлю ў Івянцы. На гэтай “зямлі” цяпер знаходзяцца музей, Цэнтр рамёстваў, рамесніцкія майстэрні, а неўзабаве з’явіцца карчма.

А зараз — пра сутнасць “Цукеркавага фэсту”. Ён, як тлумачыць Антаніна Хатэнка, — этнаграфічны, грунтуецца на легендах аб Івянцы, што быў заснаваны Вітаўтам Вялікім. За сюжэтную лінію і яе рэалізацыю адказвае зборны акцёрскіх калектыў “Майстэрня ўражанняў”, што складаецца з выпускнікоў і студэнтаў Беларускай акадэміі мастацтваў. “Вузельчыкамі” сюжэта з’яўляюцца містычныя сустрэчы з былымі ўладарамі Івянца, рыцарскія бойкі, шляхецкія пацехі, дэфіляда ў нацыянальных строях, рамесніцкія майстар-класы, фаер-шоу… А паколькі фэст мае слоган “Падсаладзі дзень!”, дык абавязковым складнікам тэатралізаванай дзеі з’яўляецца “пошук” чароўнай цукерчыны. Летась на салодкія падарункі кандытары выкарысталі… паўтары тоны цукерак.

Сёння, дарэчы, на Міншчыне распачынаецца яшчэ адна знакавая дзея — IV Абласны фестываль гульні і гумару “Капыльскія пацехі”. Тут збіраецца больш за 20 аматарскіх калектываў з 16 рэгіёнаў Міншчыны. Фестывальнае журы ўзначальвае загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і святаў БДУКіМ прафесар Пётр Гуд.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

На здымку: пад час мінулагодняга фэсту.

"Неба…" + "…Ластаўка" = …

Алена Ланская якая сёлета прадставіць Беларусь на Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні “Славянскага базару ў Віцебску”, змяніла парадак сваіх песень, абраных для гэтага спаборніцтва.

У першы конкурсны дзень, 11 ліпеня, у суправаджэнні фанаграмы “мінус адзін” спявачка прадставіць кампазіцыю “Неба ведае” Леаніда Шырына на словы Вольгі Рыжыкавай. Раней вызначаная песня “Малады і нежанаты” Васіля Раінчыка на словы Леаніда Пранчака, якая ў свой час стала адной з “візітовак” Анжалікі Агурбаш, прагучыць у выкананні Ланской напярэдадні, пад час лёсавання ў Віцебскай абласной філармоніі. У другі конкурсны дзень, 12 ліпеня, у суправаджэнні Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі на чале з народным артыстам краіны, прафесарам Міхаілам Фінбергам яна праспявае, як адзначалася раней, “Белую ластаўку” Уладзіміра Кандрусевіча на словы Вольгі Болдыравай.

— Гэтыя змены, — дала каментарый дырэктар спявачкі Юлія Палтаўская, — не такія грунтоўныя, як можа ўяўляцца. Бо з самага пачатку рыхтаваліся ўсе тры песні, адразу ж было вызначана, што з аркестрам будзе выконвацца “Белая ластаўка”. Цяперашняя паслядоўнасць падаецца нам больш мэтазгоднай. Увогуле ж, падрыхтоўка ідзе поўным ходам. Штодзень у Алёны — заняткі па вакале з Валерыем Дайнэкам, рэпетыцыі з харэографам Вольгай Шамровай. Шыюцца адметныя сцэнічныя строі, над імі працуюць маладыя беларускія дызайнеры Вольга Семчанка і Ганна Драгацэнная. Так што настрой не проста добры — лепш сказаць, актыўны і добразычлівы. У Алены Ланской і раней было шмат запрашэнняў на выступленні. Цяпер іх значна паболела, таму ад некаторых даводзіцца нават адмаўляцца: вядома, на першым плане — падрыхтоўка да конкурсу.

Н.Б.

21 чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася выстаўка Студыі ваенных мастакоў “Абаронцам Айчыны”, прысвечаная 70-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай.

Абаронцам

Творы вядомых беларускіх мастакоў і скульптараў, прадстаўленыя ў экспазіцыі, — гэта пазіцыя творцаў сённяшняга дня, жаданне аўтараў данесці тое, што перажыло старэйшае пакаленне і не выкрэсліла з народнай памяці. Гэта ўдзячнасць усім, хто прынёс нам Вялікую Перамогу, і ўсім, хто годна працягвае воінскія традыцыі, забяспечвае сёння самае галоўнае — мір на нашай зямлі. Гэта адчуванне гонару за мужных абаронцаў Радзімы!

Вобразнае ўвасабленне воінскага подзвігу ў сюжэтна-тэматычных карцінах і партрэтах, тэма сучаснасці ў работах розных жанраў, прысвечаных працы, духоўнаму свету воіна нашых дзён, сведчыць: героікапатрыятычная тэма плённа распрацоўваецца айчыннымі творцамі, сярод якіх — народныя мастакі Беларусі Георгій Паплаўскі і Іван Міско, заслужаныя дзеячы мастацтваў Мікалай Апіёк, Леанід Дударэнка, Уладзімір Церабун, Уладзімір Уродніч, мастакі Уладзімір Гардзеенка і Георгій Лойка…

Матэрыял пра выстаўку — у наступным нумары.

Купалаў кут

З 28 чэрвеня па 9 ліпеня пройдуць традыцыйныя Купалаўскія дні, што ладзяцца ўжо цягам многіх гадоў Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы.

Як распавяла “К” вучоны сакратар установы Ала Дражына, мерапрыемства распачнецца 28 чэрвеня з “Жальбінаў” — ускладання кветак да помніка Песняру на Вайсковых могілках. Там жа пройдзе літаратурны мітынг, у якім прымуць удзел беларускія пісьменнікі, прадстаўнікі выдавецтваў і ўсе ахвотныя.

А 6 ліпеня ў самім музеі адбудзецца прэзентацыя выставачнага праекта “Дзеці Дона малююць Беларусь”. У той жа дзень ва ўстанове будзе зладжаны маладзёжны праект “Купальская ноч у Купалавым доме”. У рамках мерапрыемства адбудуцца майстар-класы па выцінанцы, традыцыйных танцах, а таксама спяванне купальскіх песень з пакаазам элементаў традыцыйнага абраду ды выкананне твораў класікаў у інтэрпрэтацыі вядомых беларускіх сталых і маладых бардаў.

А кульмінацыяй Купалаўскіх дзён стане традыцыйнае Свята паэзіі, песні і народных рамёстваў “З адной думкаю аб шчасці Беларусі…”, што адбудзецца ў Вязынцы. У ім запланаваны ўдзел членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, шматлікіх творчых калектываў Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, а таксама выступленні пераможцаў адзінага на Беларусі конкурсу аўтарскай беларускамоўнай песні “Купалаўскія вакацыі” ды іншыя цікавыя мерапрыемствы.

На здымку: філіял музея — “Вязынка”.

Дэфіле "Паміж белым і чорным"

Саветнік па гуманітарных пытаннях Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы Ірына Зубко паведамляе “К”, што ў Вільнюсе пройдзе шэраг культурных мерапрыемстваў з нагоды Дня Незалежнасці нашай краіны.

Пад час свята адбудзецца ўрачысты прыём, на які збяруцца члены ўрадавай адміністрацыі, дзеячы культуры і мастацтва, прадстаўнікі дзелавых колаў і беларускай дыяспары — усяго каля 500 чалавек. На прыёме выступяць Узорны паказальны аркестр Пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь і ансамбль народнай песні і танца “Бяседа”. Таксама адбудзецца і паказ калекцый Беларускага цэнтра моды.

А з 29 чэрвеня па 9 ліпеня ў Вільнюскай ратушы пройдзе выстаўка работ загадчыка аддзела фотаілюстрацыяй газеты “Культура” Юрыя Іванова “Паміж белым і чорным”. Прэзентавацца будзе 208 фотаздымкаў — рэтраспектыва беларускай гісторыі з 1960-х гадоў да сённяшняга дня. Юрый Іваноў выстаўляецца ў Вільнюсе не першы раз, і, па словах Ірыны Зубко, творы гэтага мэтра фотамастацтва заўжды прыцягваюць увагу гледача.

Калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні родным, блізкім і сябрам з прычыны смерці артыста хора МАКАРАВА Яўгена Васільевіча.

Бігборд

Досвед, інавацыі, аналіз: “раскрыць” перліны на турыстычных магістралях

Сярод “Дзесяці прычын наведаць Беларусь” (англамоўны буклет з такой назвай быў выдадзены па заказе Міністэрства спорту і турызму краіны), прынамсі, палова наўпрост ці ўскосна датычыцца менавіта сферы культуры. І, разам з тым, так або інакш апелюе да гістарычнай спадчыны. Таму стратэгічнае супрацоўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму — з’ява заканамерная. Пасяджэнне сумеснай калегіі, якое прайшло 15 чэрвеня ў Карэліцкім і Навагрудскім раёнах Гродзенскай вобласці, было ўжо другім па ліку. Яно засведчыла як сістэмнасць інтэграцыі высілкаў дзеля агульнай мэты, так і агульныя мэты, інтарэсы... і перашкоды (пра іх — ніжэй).

Па словах міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Алега Качана, “турыстызацыя” большасці помнікаў спадчыны не з’яўляецца сур’ёзнай праблемай: па шчаслівым збегу абставін, яны знаходзяцца на магістральных напрамках айчыннага турызму. Справа толькі — у рацыянальным выкарыстанні падоранага нам продкамі патэнцыялу.

Уласна, аб гэтым і вялася гутарка пад час пасяджэння сумеснай калегіі па пытанні развіцця аб’ектаў турыстычнай індустрыі і спадарожных аб’ектаў турінфраструктуры вакол аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.

Як адзначыў у сваім уступным слове міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, падобныя мерапрыемствы ладзяцца зусім не дзеля “птушачкі” — яны павінны спрыяць вырашэнню канкрэтных праблем, актуальных для сфер культуры і турызму. Менавіта на іх міністр і папрасіў засяродзіць увагу ўсіх выступоўцаў.

Турпатэнцыял пакуль не вычарпаны...

У гісторыка-культурным турызме аб’ект паказу “Мірскі замак” з’яўляецца сваго кшталту “пілотным праектам”: ён здатны выкрышталізоўваць пэўныя тэндэнцыі, служыць узорам для іншых. І дазваляе рабіць пэўныя высновы.

Пасля свайго ўрачыстага адкрыцця музейны комплекс працуе ўсяго паўгода, але ж пэўныя дывідэнды ад укладзеных дзяржавай у рэстаўрацыю сродкаў навідавоку ўжо сёння. За пяць месяцаў колькасць наведвальнікаў узрасла ў паўтара раза параўнальна з аналагічным перыядам мінулага года, даходы — у шэсць разоў: іх сума складае каля 60% ад агульных выдаткаў на ўтрыманне комплексу.

Агучыўшы гэтыя лічбы пад час пасяджэння калегіі, Павел Латушка, у той самы час, падкрэсліў: патэнцыял росту яшчэ далёка не вычарпаны. Важны рэсурс — выкарыстанне замкавых муроў як пляцоўкі для разнастайных імпрэз. Спаслаўшыся на замежны досвед, намеснік міністра спорту і турызму Чэслаў Шульга адзначыў, што замак можа працаваць ледзь не кругласутачна: ва “ўрочны” час — як музей, а ў вечаровы і начны — як месца правядзення канцэртаў і шоу-праграм.

Мірскі замак ужо даўно стаў пляцоўкай для разнастайных фэстаў — вось і ўдзельнікі пасяджэння заспелі мантаж сцэны для ўжо традыцыйных “Вечароў АНТ”. Але, як зазначыў міністр культуры, такая дзейнасць павінна быць рэгулярнай, і магчымасці для гэтага — ёсць. І сапраўды, прадстаўнікі турбізнесу, якія прынялі ўдзел у выязным пасяджэнні, скарысталі паўзы ў праграме для перамоў з в.а. дырэктара Замкавага комплексу “Мір” Сяргеем Беразоўскім аб правядзенні ў старых мурах сваіх імпрэз.

З пункта гледжання інфраструктурнай “абалонкі”, Мірскі замак выглядае далёка не найгоршым чынам. Ды, у той самы час, спецыялісты ў адзін голас сцвярджаюць, што патэнцыял тут таксама далёка не вычарпаны. Бо надзвычайная папулярнасць гэтай адметнасці мае і адваротны бок: у летні выхадны дзень у яго ваколіцах няма дзе прыпаркаваць машыну.

Адной з перашкод для развіцця інфраструктуры вакол Мірскага замка з’яўляецца адсутнасць праекта зон аховы (да яго зацвярджэння новае будаўніцтва забаронена). Распрацоўка дакумента запаволілася. Таму міністр культуры даў даручэнне ліквідаваць гэты “тармазны фактар” цягам бліжэйшых двух месяцаў.

Разам з тым, Павел Латушка чарговы раз падкрэсліў, што выкананне беларускага заканадаўства ў сферы аховы спадчыны з’яўляецца няўхільным патрабаваннем пры стварэнні вакол помнікаў даўніны турыстычнай інфраструктуры. Бо апошняя ні ў якім выпадку не павінна “засланіць” самі каштоўнасці, якія, уласна, і забяспечваюць кліентамі аб’екты сэрвісу. І таму іх будаўніцтва ледзьве не ўсутыч да замкавых муроў недапушчальнае. Зрэшты, турысты наўрад ці палянуюцца прайсці якія пару соцень метраў...



Указальнікі да гісторыка-культурных каштоўнасцей Гродзеншчыны.

З’яўленне на такой адлегласці ад Мірскага замка прыстойнай кавяранькі з густоўнымі інтэр’ерамі і сапраўдным эспрэса “заўважыў” не толькі аўтар гэтых радкоў. Пад час пасяджэння калегіі намеснік старшыні Карэліцкага райвыканкама Руслан Абрамчык паведаміў, што леташняя выручка той невялічкай кавярні перавысіла 800 мільёнаў рублёў. Мусіць, гэтая лічба з’яўляецца добрым аргументам у бясконцых дыскусіях адносна перспектыў турінфраструктуры на Беларусі.

Замкавы комплекс “Мір” — установа зусім маладая. І, магчыма, для яе плённага развіцця будзе карысны досвед старэйшага калегі. За сем гадоў, што мінулі пасля рэстаўрацыі, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль дасягнуў папраўдзе ўнушальных вынікаў і па колькасці турыстаў, і па росце даходаў, і па асартыменце разнастайных паслуг. Пад час пасяджэння калегіі дырэктар установы Алег Рыжкоў выказаў гатоўнасць падзяліцца гэтым досведам з усімі ахвотнымі. На ягоную думку, выразная канцэпцыя турыстычнага выкарыстання помніка спадчыны павінна фарміравацца яшчэ да пачатку яго рэстаўрацыйных работ: метад “разведкі боем” тут надта рызыкоўны ды затратны.

Агратурызм у замку

Да замкаў у Міры і Навагрудку, якія, па сутнасці, з’яўляюцца кутнімі камянямі аднаго з самых масавых турмашрутаў, сёння можна смела далучыць і яшчэ адзін — Любчанскі. Намаганнямі энтузіястаў ён пакрысе ператвараецца з аблезлай руіны ў прывабную адметнасць.

У той самы час, інфраструктура тут пакуль, калі казаць без эўфемізмаў, адсутнічае. Ацаніўшы прафесійным поглядам і адноўленую вежу замка, і шыкоўныя краявіды, што адкрываюцца са стромы, Алег Качан прамовіў: тут можна зарабляць грошы! На думку міністра, пяцізоркавы гатэль выглядаў бы сярод гэтай раскошы прыроды крыху недарэчна, а вось агратурыстычны комплекс з шырокім асартыментам разнастайных паслуг (ад рыбалкі да гольфа) — сама тое!

Варта адзначыць, што мясцовыя ўлады ўжо робяць пэўныя захады ў гэтым напрамку. Як паведаміў старшыня Навагрудскага райвыканкама Анатоль Маркевіч, 1 верасня вучэбна-вытворчы комплекс, які займае будынак былога палацу, перамесціцца на іншы адрас. Новае жытло будзе прадастаўлена і чатыром сем’ям, што паранейшаму жывуць у флігелі. Адразу пасля гэтага пачнецца пошук інвестараў.

У якасці аднаго з магчымых варыянтаў Алег Качан бачыць “прышэсце” на тэрыторыю сядзібна-замкавага комплексу мясцовага СВК “Прынёманскі”. Напрыканцы мінулага года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ, паводле якога суб’ектам аграэкатурызму можа стаць не толькі прыватнік, але і сельскагаспадарчае прадпрыемства.

Адзінкавыя прыклады існуюць ужо даволі даўно і надзвычай паспяхова — варта згадаць хаця б “страусіны” комплекс “Салаўіны гай”, створаны на Пастаўшчыне па ініцыятыве няўрымслівага наватара Алега Валадзько. Ці выкарыстаюць такія напрацоўкі кіраўнікі іншых гаспадарак, атрымаўшы для гэтага стымул ад дзяржавы? Вырашаць, натуральна, ім самім. Але прыклад таго, як “няпрофільная” ў сферы турызму арганізацыя здатная асвоіць новую тэрыторыю і палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, можна знайсці ледзь не ля ўзножжа замка. Збудаваўшы паляўнічы дамок, мясцовы лясгас здолеў з яго дапамогай зарабіць за мінулы год амаль 100 мільёнаў рублёў, павялічыўшы свае даходы ў разы.

Дырэктар дабрачыннага фонду “Любчанскі замак” Іван Пячынскі ні пра якія прыбыткі нават і не думае. Ён — энтузіяст з вялікай літары, і таму галоўнае яго цяперашняе памкненне — аднавіць унікальны для нашых краёў рэнесансавы купал па-над уязной вежай. Але... Як адзначыў Алег Качан, для хутчэйшага працягу рэстаўрацыйных работ патрэбны грошы, і найважнейшай іх крыніцай можа стаць менавіта турбізнес.

Адпаведна, удзельнікі пасяджэння маглі ўвачавідкі пераканацца, што “пункты судакранання” паміж адраджэннем спадчыны і турызмам сустракаюцца літаральна на кожным кроку.

Магчымасці для асабістых унёскаў

У якасці сведчання дзяржаўнай палітыкі ў справе адраджэння спадчыны Павел Латушка прывёў канкрэтныя лічбы. На правядзенне рэстаўрацыйных работ у мінулую пяцігодку з бюджэту было выдаткавана больш за 500 мільярдаў рублёў. Сёлета гэтая сума мае скласці болей за 160 мільярдаў рублёў. А Дзяржпраграма “Культура Беларусі” на бліжэйшую пяцігодку прадугледжвае фінансаванне рэстаўрацыйных работ на 34 аб’ектах спадчыны. Тым часам, згодна з Даручэннем Кіраўніка дзяржавы, Міністэрства культуры краіны ўжо падрыхтавала праект яшчэ адной Дзяржпраграмы — “Замкі Беларусі”, якая ахоплівае каля 38 аб’ектаў (замкаў, руін замкаў і замчышчаў). Матэрыяльнае вымярэнне гэтай глабальнай ініцыятывы — 318 мільярдаў рублёў за кошт усіх крыніц фінансавання.

У той самы час, міністр культуры чарговы раз адзначыў важнасць прыцягнення ў гэтую сферу пазабюджэтных сродкаў. Апошняму павінен спрыяць Указ Прэзідэнта № 145, які ўступае ў сілу 1 ліпеня бягучага года. Згодна з ім прадугледжваецца вызваленне ад падатку на прыбытак той сумы (да 10% ад валавога прыбытку), якую арганізацыя скіроўвае на правядзенне рэстаўрацыйных работ.

— Неабходна, каб у грамадства было ўсведамленне таго, што клопат па аднаўленні каштоўнасцей не з’яўлецца выключна місіяй дзяржавы, — адзначыў міністр культуры. — Грамадства таксама павінна надаваць гэтаму ўвагу і ўдзельнічаць не толькі праз выплату падаткаў, якія ідуць, у тым ліку, і на аднаўленне помнікаў, але і праз ахвяраванні...

Як адзначыў Павел Латушка, гэта мае не толькі эканамічны, але і выхаваўчы эфект, бо спрыяе асабістаму ўсведамленню важнасці помнікаў спадчыны. А для такіх унёскаў створаны новыя, больш камфортныя, магчымасці.

Пад час рабочай нарады па пытаннях прыцягнення пазабюджэтных сродкаў на кансервацыю Навагрудскага замка намеснік старшыні Рэспубліканскага савета па пытаннях культуры і мастацтва Анатоль Бутэвіч выказаў прапанову ўстанавіць на папулярных тураб’ектах скрыні-скарбонкі, бо не кожны ахвотны ахвяраваць на добрую справу пасільную суму знойдзе час на наведанне банка. Нарада прайшла зусім нядаўна, а сёння гэтая прапанова ўжо ўвасоблена ў жыццё. На пасяджэнні калегіі адбылася своеасаблівая прэзентацыя такой скарбонкі. Пад апладысменты прысутных першыя ахвяраванні зрабілі Павел Латушка і Алег Качан. Неўзабаве да іх з ахвотай далучыўся і сам аўтар задумы, які акурат у той дзень прымаў ад прысутных віншаванні з 70-годдзем.

Натуральна, такая грамадзянская пазіцыя павінна быць уласціва і ўласнікам ды карыстальнікам аб’ектаў спадчыны. Каб забяспечыць іх дадатковым стымулам да выканання сваіх юрыдычных і маральных абавязкаў, сёлета Міністэрства культуры плануе правесці конкурс на лепшы прыклад аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці, вызначыўшы трох пераможцаў і заахвоціўшы іх грашовымі прэміямі.

Скрыні для збору сродкаў усталююць ва ўстановах культуры і не толькі.

Джунглі ў фальварку

Самым праблемным аб’ектам спадчыны, які сустрэўся на маршруце выязнога пасяджэння, без сумневу, была сядзіба Храптовічаў у Шчорсах. Для шляхецкіх маёнткаў яе лёс характэрны. І будучыня будынка, дзе месцілася знакамітая бібліятэка, у якой часцяком працаваў сам Міцкевіч, пакуль вельмі няпэўная. Тое ж самае тычыцца і фальварка Мураванка, які гэтай парой ператварыўся ў сапраўдныя джунглі.

— Наша першасная задача — навесці там парадак, каб людзі маглі прыехаць і ўбачыць хараство гэтых мясцін, — у сваім выступленні Анатоль Маркевіч не абмінуў і тэму Шчорсаў. — У той самы час, ствараецца пакет дакументаў, неабходных для таго, каб выставіць аб’ект на аўкцыён...

Як адзначыў старшыня райвыканкама, падобны лёс чакае і колішнюю сядзібу О’Руркаў ва Усялюбе, дзе нядаўна была праведзена прэвентыўная кансервацыя.

— У перспектыве яна можа быць выкарыстана для стварэння аграсядзібы ў стылі шляхецкага фальварка для турыстаў сярэдняга класа, — дадаў Анатоль Маркевіч.

Працэс перадачы былых шляхецкіх сядзіб у прыватныя рукі яўна “падбуксоўвае”: з 46 маёнткаў, уключаных у адмысловы спіс, новых гаспадароў знайшлі ўсяго чатыры. Сярод імаверных прычын пад час пасяджэння былі адзначаны тры: пасіўнасць многіх прадстаўнікоў мясцовых улад, слабое інфармацыйнае забеспячэнне кампаніі, а таксама — праблемы заканадаўчыя. Так, сёння стартавую цану аб’екта спадчыны вызначае ацэнка экспертаў. Яна і сама па сабе каштуе нямала для раённых улад, і сумы ў выніку атрымліваюцца непад’ёмныя для інвестара.

Таму яшчэ на папярэдняй сумеснай калегіі двух міністэрстваў было прынята рашэнне ініцыяваць змены ў заканадаўства, якія спрашчалі б шлях паміж зацікаўленым інвестарам і закінутай сядзібай. Тым не менш, распрацоўка дакумента, што патрабуе ўзгаднення ў роз-

з матывацыяй,

або Як ператварыць "раскрутку" спадчыны ў піяр-атаку?

ных ведамствах, зацягнулася. Павел Латушка даў даручэнне вырашыць гэтую задачу цягам месяца.

У дадатак да білета ў музей

Як і выпадала чакаць, асаблівая ўвага пад час пасяджэння калегіі была нададзена развіццю турыстычнай інфраструктуры. Праблема мае два аспекты: з аднаго боку, брак сэрвісу стрымлівае развіццё турызму, а з другога — не дазваляе выкшталцоным аб'ектам паказу прыносіць належныя эканамічныя дывідэнды. Бо іх даюць менавіта "спадарожныя паслугі": абед у рэстаране каштуе куды даражэй за білет у музей. Той самы Навагрудак штогод наведваюць многія дзясяткі тысяч "арганізаваных" і самастойных турыстаў, але ці шмат прыбытку мае з гэтага сам горад?

Нястачу кавярняў у цэнтры Гродна мог адзначыць ці не кожны яго наведвальнік, ды і ва ўсім рэгіёне тая праблема даецца ў знакі. Пад час пасяджэння Алег Качан падмацаваў гэтыя эмпірычныя назіранні канкрэтнай статыстыкай: у намінацыі "Грамадскае харчаванне" вобласць займае апошняе месца ў краіне! Не нашмат лепшы рэйтынг і па частцы гатэляў (5-е месца) ды аб'ектаў прыдарожнага сервісу (6-е месца). Як адзначыў міністр спорту і турызму, такія вынікі ніяк не вяжуцца з тым густым россыпам прыцягальных для турыстаў гісторыка-культурных каштоўнасцей, якімі па праве ганарыцца Гродзеншчына.

Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар Жук не толькі прызнаў наяўнасць дадзенай праблемы, але і заявіў пра тое, што яна ўжо на стадыі вырашэння. Так, ужо сёлета ў цэнтры Гродна ўзнікла сем новых кавярняў (мабыць, больш, чым было!), а да канца года іх колькасць мае ўзрасці да 20.

У сваім выступленні на пасяджэнні калегіі старшыня Навагрудскага райвыканкама Анатоль Маркевіч вельмі шчыра і самакрытычна ахарактарызаваў развіццё турінфраструктуры горада:

— Пра маштабную і мэтанакіраваную работу ў гэтым напрамку казаць пакуль праблематычна. Але наперадзе ў нас — шмат планаў і задум...

Два гарадскія гатэлі — дзяржаўны і прыватны — могуць адначасова размясціць усяго 105 гасцей, прычым большасць тых "койкамесцаў" далёкія ад еўрапейскіх стандартаў. З шырока праанансаваным у свой час адраджэннем гатэля "Еўропа" выйшла, як кажуць, замінка. Пляцоўка па-ранейшаму пустая: з тых або іншых прычын, інвестар свае планы не ажыццявіў, і цяпер раённай адміністрацыі давядзецца ісці па другім коле. А з аб'ектамі харчавання (ці, дакладней, утульнымі кавярнямі) у Навагрудку справа зусім кепская.

У той самы час, у старой камяніцы на цэнтральнай плошчы ўжо вядуцца рамонтныя работы. Там плануецца размясціць і невялічкі гатэльчык, і прыстойны рэстаран. Для інвестараў падрыхтаваны і іншыя падобныя пляцоўкі, і таму старшыня райвыканкама спадзяецца, што неўзабаве статус-кво ў справе інфраструктуры будзе выпраўлены.

Анатоль Маркевіч, які займае сваю цяперашнюю пасаду зусім нядаўна, з імпэтам узяўся за вырашэнне тых праблем, якія здаваліся ледзь не "вечнымі". Сярод іх — і "зачыстка" прызамкавай тэрыторыі ад шэрых і непрыглядных буданчыкаў — досыць неадэкватнага атачэння для такога гістарычнага месца.

— Мы ўжо займаемся гэтай работай, — паведаміў пад час пасяджэння Анатоль Маркевіч.

На месцы старых хібар старшыня райвыканкама ў перспектыве бачыць усе патрэбныя для турыстаў аб'екты інфраструктуры: і стаянку, і санвузлы, і сувенірныя крамы... Але для больш дэталёвага планавання ён лічыць неабходным папярэдне пракансультавацца са спецыялістамі.

Словы "інфраструктура" і "інвестыцыі" ў наш век падаюцца амаль аднакарэннымі. Кожнаму зразумела, што першае залежыць ад другога — і ніяк інакш! Таму на Гродзеншчыне неўзабаве стартуе праект, які на пасяджэнні калегіі таксама быў названы "пілотным". Яго мэта — насычэнне тураб'ектамі ваколіц Аўгустоўскага канала. А сродкі — стварэнне максімальна спрыяльных умоў для інвестараў. 26 мая быў падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 220 "Аб стварэнні спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку "Аўгустоўскі канал". Гэтая тэрыторыя атрымала статус свабоднай эканамічнай зоны — з усімі прыемнымі наступствамі для інвестараў.

— Калі мы пачалі аналізаваць, чаму не развіваецца турызм на Аўгустоўскім канале, дык неўзабаве зрабілі такую высноў: дзяржарганізацыя, якая кіравала гэтай тэрыторыяй, не спрыяла прыцягненню інвестыцый, — распавёў старшыня гродзенскага аддзялення Рэспубліканскага спартыўна-турысцкага саюза Сяргей Каляда.

Ён ужо сёння гатовы назваць сем інвестараў з Гродна, гатовых укладаць сродкі ў развіццё інфраструктуры на Аўгустоўскім канале. Адзначае і зацікаўленасць прадпрымальнікаў з польскага боку — дзе, дарэчы, такіх ільготных умоў няма.

"Made in Навагрудак"

Ля пачатку брукаванай сцежкі ў Навагрудскі замак размясціліся два латкі з сувенірнай прадукцыяй. Першы прадстаўляў адметныя вырабы майстроў з раённага Цэнтра рамёстваў, а другі прапаноўваў даволі някепскі асартымент карт, буклетаў, дыскаў з фільмамі, фота ў рамцы з тымі самымі абрысамі вежаў... На адваротным баку аднаго з іх прыкмеціў надпіс: "Зроблена ў Навагрудку".

Нярэдка на сувенірах, якія прадаюць ля нашых турадметнасцей, пазначаны зусім іншы "адрас", куды больш геаграфічна аддалены... Такую фабрычную штампоўку можна напаткаць ці не ў кожным горадзе свету. А вось майстроўскія вырабы "made in Навагрудак" не купіш ні ў Ноўгарадзе, ні ў Ньюкасле, ні дзе яшчэ. І турысты зазвычай вельмі чула рэагуюць на эксклюзіў.

Убачаны прыклад чарговы раз засведчыў, што праблема арыгінальных сувеніраў — цалкам вырашальная, прычым выключна на "мясцовым" узроўні. Алег Качан выказаў надзею, што сістэмная праца ў дадзеным кірунку стане пастаяннай, і латкі настала "прапішуцца" ля старых валоў.

Трапіўшы на тэрыторыю замка, удзельнікі пасяджэння маглі пераканацца, што "на месцы" можна вырашыць і іншую праблему — турыстычнай атракцыі. Рыцары ўжо рыхтавалі паходні для свайго міні-спектакля... Пачэсным гасцям ён спадабаўся — хіба з той заўвагай, што на Навагрудскім замчышчы куды арганічней гучала б беларуская мова.

Здавалася б, у горадзе, які спарадзіў усебеларускую моду на сярэднявечныя фэсты, людзьмі ў шаломах ды кальчугах нікога ўжо не здзівіш. Але рыцары, якіх мы бачым пад час тых імпрэз, — гэта "варагі", якія прыязджаюць у Навагрудак усяго на некалькі дзён. Іншая справа — рыцары свае, тутэйшыя. Ім не трэба ехаць за сотні кіламетраў, каб "ажывіць" старыя руіны. Мясцовыя воі могуць рабіць гэта не раз на два гады, а хоць кожныя выхадныя — прыкладам, у фармаце "адкрытых трэніровак" або запланаваных на канкрэтны час паказальных выступленняў. А потым, "напрацаваўшы мускулы", магчыма, створаць і адмысловы турпрадукт "за асобную плату", як гэта ўжо даўно і паспяхова практыкуюць іх лідскія "браты па зброі".

Таму і не дзіва, што намеснік старшыні райвыканкама Алена Ермакова ведае найноўшую гісторыю мясцовага рыцарства ў дэталях і ставіцца да гэтай маладзёжнай ініцыятывы вельмі ўважліва. Ды і Клуб гістарычнай рэканструкцыі, які сфарміраваўся толькі ў лістападзе мінулага года, мае красамоўную назву — "Мэта".

Пра турівэнты і анімацыю гутарка пад час пасяджэння вялася неаднаразова. Як адзначыў Чэслаў Шульга, вельмі важна, каб у кожным прыцягальным для турыстаў гарадку з'явіўся свой пазнавальны "брэнд". Як адзначыў намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар Жук, у рэгіёне пастаўлена задача стварыць такі "падзейны" турбрэнд у кожным раёне. А Павел Латушка запэўніў, што навагрудскі фэст і надалей будзе мець падтрымку Міністэрства культуры краіны.

Начальнік упраўлення па ахове гістрыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры краіны Ігар Чарняўскі чарговы раз звярнуў увагу на тое, што каляндар такіх "івэнтаў" павінен распрацоўвацца загадзя і змяшчацца як на сайтах абодвух міністэрстваў, гэтак і на вэб-рэсурсах мясцовых органаў улады.

Цікавы прыклад такой "разыначкі" прывёў Алег Рыжкоў: своеасаблівы "цюльпанавы" фэст, які ладзіцца ў гомельскім парку цягам вось ужо пяці гадоў.

— Уявіце сабе: адначасова раскрываюцца 70 тысяч цюльпанаў! І турысты з Браншчыны ды Смаленшчыны цэлымі аўтобусамі едуць, каб паглядзець на гэты цуд!..

У цэлым, гэтае пасяджэнне калегіі адлюстравала вельмі прыемную тэндэнцыю — актывізацыю мясцовай улады ў справе развіцця турызму ў сваіх рэгіёнах. Можа, некаторыя яе прадстаўнікі ўсё яшчэ чакаюць "добрых дзядзькаў" звонку, якія самі да іх "прыедуць і разаўюць", але многія смела бяруць ініцыятыву ў свае рукі і распрацоўваюць свае амбітныя ды маштабныя праекты. Своеасаблівая прэзентацыя аднаго з іх адбылася і на пасяджэнні сумеснай калегіі. Намеснік старшыні Глыбоцкага райвыканкама Галіна Унуковіч распавяла пра задуму стварэння ў гэтым мілым гарадку музейнага квартала — праз стылізацыю пад даўніну будынкаў на плошчы 17 верасня. Варта адзначыць, што прыгожы праект суправаджаўся прагматычным абгрунтаваннем яго мэтазгоднасці. Міністр культуры ўзняў пытанне аб стварэнні ў Глыбокім Музея Язэпа Драздовіча.

Як адзначыў Анатоль Маркевіч, раённыя ўлады паставілі перад кожным сельсаветам Навагрудчыны задачу распрацаваць уласны арыгінальны туправдукт.

— Вядома, гэта зусім няпроста, ды і старшыні сельсавета не заўсёды добра абазнаны ў тэме турызму, — дадаў ён. — Але планамерная работа ўжо прыводзіць да пэўных зрухаў.

Праблема рэкламы

Яшчэ адной "скразной тэмай" на пасяджэнні калегіі стала праблема рэкламы, піяру і інфармацыйнага забеспячэння турызму ў цэлым. Як адзначыў дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму краіны Уладзімір Кармазін, толькі за сродкі з рэспубліканскага бюджэту ў мінулыя тры гады было выпушчана 300 тысяч асобнікаў друкаванай рэкламнай прадукцыі. Да таго ж, беларускі турызм прадстаўлены на многіх міжнародных выстаўках. Але... Пра масіраваную піяр-атаку па ўсіх франтах казаць, нагэўна, пакуль не выпадае. Хаця менавіта яна можа змяніць становішча і з экспартам турпаслуг, і з унутраным іх спажываннем.

Павел Латушка звярнуўся да практыкі іншых краін, якія актыўна рэкламуюць свой турпрадукт на нашай тэрыторыі і праз пасрэдніцтва айчынных СМІ. Прычым гэта менавіта іміджавая рэклама, скіраваная на пазіцыянаванне краіны ў цэлым, а не канкрэтнага курорта або гатэля. У той самы час, бігборды і ролікі, якія матывавалі б "прыехаць у Беларусь", за мяжой пакуль не сустрэнеш.

Міністр культуры прывёў у якасці прыкладу і іншую практыку, якая істотна стымулюе рост унутранага турыстычнага рынку. Скажам, у Варшаве можна ўбачыць бігборды з заклікам "прыехаць у Кракаў" (які, здавалася б, рэкламы не патрабуе, бо з'яўляецца адной з найпапулярнейшых турмясцін Еўропы) — і наадварот. Таму ўзнікла прапанова больш актыўна і мэтанакіравана задзейнічаць для папулярызацыі турызму ўнутры краіны айчынныя медыярэсурсы — прычым пачаўшы менавіта з "раскруткі" Навагрудка з дапамогай адмысловага тэлероліка.

Падаецца, такія захады ў перспектыве могуць забяспечыць добрую выручку не толькі 20, але і 120 гродзенскім кавярням — вядома, калі да іх дададуцца яшчэ і гатэлі "на розную кішэню"...

Іншы аспект інфармацыйнага забеспячэння турмаршрутаў — указальнікі і карты непасрэдна на вуліцах гарадоў. Без іх "самастойнаму" турысту (а тым больш — замежніку) арыентавацца ў прасторы, бадай, немагчыма. З вялікага спісу беларускіх гарадоў, дзе няма ніводнай англамоўнай "стрэлкі", можна з радасцю выкрэсліць Навагрудак: на яго галоўнай плошчы такі ўказальнік нядаўна з'явіўся. Па звестках Уладзіміра Кармазіна, за апошнія тры гады ў краіне было ўстаноўлена каля тысячы разнастайных інфармацыйных шчытоў, знакаў і ўказальнікаў.

■■■

Як адзначыў пад час пасяджэння Алег Качан, для развіцця турызму сёння неабходна некалькі складнікаў: выкарыстанне досведу (у тым ліку і замежнага), інавацыі, аналітычныя здольнасці. А таксама — каардынацыя высілкаў усіх зацікаўленых суб'ектаў. На думку міністра спорту і турызму, своеасаблівыя міжведамасныя "міні-калегіі" павінны ўтварацца ў кожным раёне.

Развіваючы гэтую думку, Павел Латушка прапанаваў шэраг канкрэтных супольных праектаў — у прыватнасці, па рэкламна-інфармацыйным забеспячэнні турызму. Адпаведна, супрацоўніцтва паміж двума міністэрствамі набывае ўсё больш выразныя абрысы. І гэта заканамерна, бо інакш, як сумеснымі намаганнямі, набалелых пытанняў не вырашыць.

Любчанскі і Навагрудскі замкі, а таксама бібліятэка Храптовічаў сталі пунктамі прыпынку выязной калегіі.

Ілля СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Карэліцкі раён — Навагрудскі раён — Мінск
Фота аўтара

КНІГА СТАІЦЬ на трох “кітах”

Кантэнт, мастак, выдавец

З 28 чэрвеня па 3 ліпеня ў Маскве мае адбыцца Міжнародная выстаўка. Правядзенне яе прысвечана 20-годдзю Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Зрэшты, сёлета кантэкстам гэтай значнай падзеі ў рэчышчы міжнародных стасункаў напоўнены многія мерапрыемствы. Увогуле ж, у рамках СНД багата ўвагі надаецца менавіта культурнаму складніку супрацоўніцтва, многія з праяў якога цягам двух дзясяткаў гадоў станавіліся добрай традыцыяй. Чарговы доказ гэтаму — VIII Міжнародны конкурс “Мастацтва кнігі дзяржаў — удзельніц СНД”. Ён чарговы раз пераканаў, што нашы выдаўцы па-ранейшаму ўмеюць здзіўляць і зачароўваць чытацкія сэрцы.

На конкурсе прадстаўлялася больш за сотню выданняў з Арменіі, Казахстана, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Украіны, Эстоніі… Айчынныя кнігавыдаўцы “адзначыліся” па ўсіх сямі намінацыях: “Гран-пры”, “Арткніга”, “Мая краіна”, “Кніга для дзяцей і юнацтва”, “Аддрукавана ў Садружнасці”, “Садружнасць”, “Культура. Навука. Адукацыя”. Гран-пры атрымала выданне “Радзівілы. Альбом партрэтаў XVIII — XIX стагоддзяў” “Беларускай энцыклапедыі” імя П.Броўкі. Апрача вышэйшай узнагароды на нашым рахунку яшчэ — шэсць дыпломаў…

Пра тое, якім быў сёлетні конкурс, якую ўвогуле ён мае перадгісторыю і тэндэнцыю развіцця, распавядае “К” намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар ЛАПЦЁНАК:

— Не магу не згадаць, што спярша, за савецкім часам, гэта быў конкурс “Мастацтва кнігі” СССР. Знік Саюз — знік конкурс. Мы вельмі хацелі вярнуць традыцыю і нагоду для перыядычнай сустрэчы з калегамі, канкурэнтамі і параўнаць нашы кнігавыдавецкія намаганні… Словам, Беларусь заўжды была ініцыятарам аднаўлення такога спаборніцтва. Урэшце, у Мінскай штаб-кватэры СНД прапанову падтрымалі, і восем гадоў таму “Мастацтва кнігі стартавала, гэтым разам — на абсягах СНД. Мы тады атрымалі Гран-пры за альбом “Чарнобыль”.

— Ігар Мікалаевіч, падаецца, Беларусь заўжды была “рэкардсменкай” па колькасці атрыманых на “Мастацтве кнігі” дыпломаў? Сёлета іх, да прыкладу, ажно сем…

— Так, хоць канкурэнцыя расла з кожным конкурсам. Чатыры Гран-пры за восем гадоў — факт паказальны. А сёлета лаўрэацкія дыпломы атрымалі кнігі “Брэсцкая крэпасць. Вайна і мір”, “Маленькі анёл. Хрысціянская азбука”. Дыпломамі ўганараваны выданні “Архітэктура Беларусі. Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. IX — XX стст.”, “Сучасны беларускі жывапіс. XXI стагоддзе”, “IN NOMINE DOMINI. У Імя Бога”. А таксама спецыяльны дыплом журы прысуджаны новаму выданню твора Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”, прэзентацыя якога адбылася ўжо ў дзесяці краінах свету.

— У чым, на ваш погляд, перадумовы стварэння добрай кнігі?

— Гэта тры добра вядомыя ўсім “кіты”: моцны аўтарскі калектыў, што выдае на-гара якасны тэкст, кантэнт; цікавыя кніжныя мастакі-графікі кшталту Шаранговіча, Паплаўскага, Славука, Савіча, якія стварылі айчынную сучасную школу ілюстратараў (іншая справа, што традыцыі яе развіваюцца сёння не так актыўна, як нам хацелася б); годная паліграфічная база. Гэтыя тры складнікі заўжды вызначалі і вызначаюць Беларусь у ліку лепшых кнігавыдавецкіх краін… Словам, над кнігай працуюць людзі апантаныя. Не магу не згадаць Міхаіла Іванавіча Дзяльца, які доўгі час узначальваў Дзяржкамвыд і развіваў як мае быць дзесяць нашых выдавецтваў… А Мінская фабрыка каляровага друку і па сёння адна з самых “прасунутых” на прасторах СНД.

— І, натуральна, якасць нашай кніжнай прадукцыі адсочваецца светам не толькі на маскоўскім конкурсе?

— Пачынаем “каляндар” выставак з лютаўскага Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Потым — сакавіцкія і вераснёўскія прэзентацыі ў Маскве. А яшчэ — кірмашы ў Пецярбургу, Кіеве, Варшаве. Нашых кнігавыдаўцоў рэгулярна запрашаюць у Туркменію, Казахстан. А вынікі таго, што робіцца ў кніжным свеце, падводзім на кастрычніцкім франкфурцкім Міжнародным кірмашы. Вы ведаеце, што там штогод выбіраецца 100 — 200 лепшых кніг. У іх лік пастаянна трапляюць і беларускія выданні. Я быў вельмі ўражаны ў 2002 годзе, калі ў названую сотню ўвайшлі чатыры нашы падручнікі і толькі два — амерыканскія. Ці ж не паказчык?

— Колькі слоў пра перспектывы айчыннага кнігавыдання.

— Безумоўна, мы цяпер знаходзімся ў больш складаных умовах. Афсетная папера, што каштавала ў студзені тры мільёны рублёў цяпер сягае ў рыначнай цане да 20 мільёнаў… Тым не менш, вынікі конкурсу ў Маскве засведчылі: мы здолелі падрыхтаваць цікавыя кнігі, яны атрымалі годную ацэнку сярод міжнародных калег. У гэтым кірунку будзем рухацца і надалей. А чытацкі попыт сцвярджае: усё большую папулярнасць набываюць элітарная кніга, падарункавае выданне кшталту “Дзікага паляванння караля Стаха” ці альбома “Радзівілы”… У нас ёсць магчымасць, ёсць над чым працаваць, што прэзентаваць. На камбінаце дзейнічае новая пяціколерная друкарская машына, што значна павышае паліграфічную якасць… Нельга забывацца і на тое, што людзі ва ўзросце ад 25 да 60 гадоў чытаюць збольшага спецыяльную, даведачную літаратуру для самаразвіцця. Натуральна, мы імкнёмся задаволіць і іхнія густы. Але на пачатку года Міністэрства інфармацыі распачало ўсеагульную кампанію па падтрымцы чытання. Лічым, што гэта — адна з галоўных праблем станаўлення духоўнасці. Да кнігі прывучаць трэба з дзяцінства.

— І апошняе пытанне, Ігар Мікалаевіч. Як з той нагоды, што народ ад чытання “адвык”, вы ацэньваеце дзейнасць нашай бібліятэчнай сістэмы?

— Якасць працы бібліятэкара залежыць ад колькасці кнігавыдач. А якую кнігу можна выдаць чытачу без асаблівых праблем? Правільна: так званую камерцыйную. У сённяшнім беларускім кнігавыдавецтве акцэнт — на сацыяльна значную літаратуру. І да яе трэба чытача прывучаць. Згодны, праца — скрупулёзная, штодзённая і патрабуе апантанасці… Не скажу, што з гэтай нагоды з бібліятэкарамі змагаемся, але імкнёмся пастаянна супрацоўнічаць. Праз пару дзён павінна адбыцца нарада з прадстаўнікамі сфер культуры і адукацыі па пытаннях далучэння грамадства да чытання.

Гутарыў Яўген РАГІН
Фота Юрыя ІВАНОВА

Тым часам

Дзясятка Караткевіча

Адной з кніг, што стала фаварытам сёлетняга міжнароднага конкурсу “Мастацтва кнігі” — фаліянт “Дзікае паляванне караля Стаха” на чатырох мова, выдадзены па ініцыятыве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Беларускага фонду культуры летась, да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча.

Як ужо паведамляла “К”, цягам апошняга паўгоддзя адбываліся яе шматлікія прэзентацыі ў замежжы. Сёння колькасць такіх піяр-акцый дасягнула дзясятка. Дзе ж пабывала наша “…Паляванне”?

Азербайджан, Арменія, Казахстан, Латвія, Літва, Малдова, Польшча, Расія, Украіна, Эстонія… І паўсюдна падзеі адбываліся з удзелам прадстаўнікоў айчынных дыпрадстаўніцтваў, а таксама — шырокай грамадскасці. Арганізатарамі ж акцыі па прэзентацыі фаліянта выступілі Міністэрства культуры, Міністэрства замежных спраў, Беларускі фонд культуры, дыпламатычныя і консульскія ўстановы нашай краіны за мяжой.

У Расіі прэзентацыя прайшла, у прыватнасці, у Санкт-Пецярбургу, а таксама ў Новасібірскім цэнтры беларускай культуры. Тры асобнікі фаліянта былі перададзены беларускім Пасольствам Нацыянальнай бібліятэцы і Нацыянальнаму музею літаратуры Украіны, Цэнтру беларускай мовы і культуры пры Інстытуце філалогіі Кіеўскага ўніверсітэта.

У Арменіі прэзентацыя кнігі адбылася на факультэце агульнай філалогіі Расійска-Армянскага (Славянскага) універсітэта. Асобнік кнігі быў уручаны рэктару ўніверсітэта для папаўнення бібліятэчнага фонду факультэта, пры якім створана краіназнаўчая экспазіцыя. У Азербайджане ж том прадставілі ў Бакінскім славянскім універсітэце пад час сумеснага пасяджэння Таварыства дружбы і супрацоўніцтва “Азербайджан — Беларусь”. У рамках вечара, прысвечанага жыццю і творчасці Уладзіміра Караткевіча, адбылася прэзентацыя кнігі ў Казахстане.

А ў Латвіі “Дзікае паляванне караля Стаха” прадставілі ў Акадэмічнай бібліятэцы, бібліятэцы Латвійскага ўніверсітэта і Рыжскай беларускай школе з удзелам прадстаўнікоў Саюза беларусаў Латвіі. У Літве ўнікальны том выстаўляўся на айчынным стэндзе XII Міжнароднага кніжнага кірмашу. Эстонская прэзентацыя кнігі адбылася ў бібліятэцы імя Уладзіміра Караткевіча, нядаўна адкрытай у Таліне.

У рамках літаратурных чытанняў з удзелам беларускіх суполак у Кішынёве і Тыраспалі “Дзікае паляванне караля Стаха” прадстаўлена ў Малдове. А пра нядаўнюю польскую прэзентацыю на філалагічным факультэце Варшаўскага ўніверсітэта, у рамках якой у бібліятэчныя фонды факультэта і Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы былі перададзены асобнікі кнігі, “К” пісала літаральна два нумары таму. Таксама праведзена прэзентацыя кнігі ў Беластоку — у Культурным цэнтры Беларусі ў Польшчы.

Золата, срэбра і “Карсар”

Хор студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі быў уганараваны ў час фестываляў харавой музыкі ў Германіі.

Як паведамляюць у БДАМ, хор пад кіраўніцтвам дацэнта Інесы Бадзяка, пра поспехі якога “К” неаднойчы пісала, прыняў удзел у міжнародным фестывалі “Harmonie Festival” у Лімбургу і фестывалі вакальнай музыкі “Klangvocal” у Дортмундзе. На форумах хор атрымаў тры залатыя дыпломы і адзін сярэбраны ў намінацыях “Маладзёжныя хоры”, “Камерныя жаночыя хоры”, “Змяшаныя хоры”, “Джазавы вакал і іншыя жанры” (ансамблевае выступленне).

На фестывалі ж вакальнай музыкі “Klangvocal” у Дортмундзе хор БДАМ удзельнічаў у запісе оперы Джузэпэ Вердзі “Карсар” на найбуйнейшай у Еўропе студыі разам са знакамітымі выканаўцамі Марыяй Гулегінай, Себасцьянам Катана, Аленай Мазук ды іншымі.

Ад Новага — да Нэмэна

Гэты тыдзень выдаўся багатым на джазавыя падзеі.

Сёння і заўтра горад над Нёманам прымае V Міжнародны фестываль “Гродна-джаз”. Яго арганізатарамі сёлета сталі аддзел культуры гарвыканкама, абласная філармонія пры падтрымцы генеральнага консульства Польшчы ў абласным цэнтры.

Свята прыме аматараў джаза ў двары Новага замка, дзе сёння адбудзецца юбілейны канцэрт аркестра Гродзенскай абласной філармоніі пад кіраўніцтвам Барыса Мягкова. У ім запланаваны ўдзел, сярод іншых, і артыстаў, што ў розныя гады выступалі ў складзе легендарных “Песняроў”: Валерыя Дайнэкі, Аляксандра Кацікава, Валерыя Скаражонка.

А ў сталічнай філармоніі ў мінулы аўторак джазавыя ж імправізацыі на тэмы найвядомых твораў знакамітага музыканта — ураджэнца Беларусі Чэслава Нэмэна прэзентавала польскае трыа Артура Дудкевіча.

Пленэр чаромхі і бэзу

У горадзе над Нёманам прайшоў V Міжнародны мастацкі пленэр “Гродна — дарог скрыжаванне”. І як вынік — у чэрвені ў Гродзенскай выставачнай зале працуе выстаўка, у якой прынялі ўдзел 12 мастакоў з Беларусі, Літвы і Польшчы. Экспазіцыя ўражвае разнастайнасцю выкарыстаных тэхнік: акварэль, алей, аловак, туш.

Тэма сёлетняга пленэру — “Гісторыя і сучаснасць”, якую мастакі інтэрпрэтавалі досыць шырока. Так, на карцінах Паўла Татарнікава “Будаўніцтва белай піраміды”, “Непрыкметнае жыццё на вёсцы”, “Гульня ў хованкі на белым” пільнае вока разглядзіць… камароў. Дарэчы, сам мастак лічыць, што гродзенская сустрэча мастакоў — гэта зерне, якое абавязкова прынясе плён.

Упершыню культурная падзея перамясцілася з восені на май, дзякуючы чаму пленэр узбагаціўся новымі фарбамі, сярод якіх мастакі ўзгадалі колер чаромхі і бэзу. Па-вясноваму гучаць і назвы карцін: “Каштанавы пах” Аістэ Чарнютэ, “Ралля” Вікторыі Ільіной, “Дзяўчына і вясновы сад” Аляксандра Вазбінаса. Зразумела, што асаблівую ўвагу майстры надалі жанру пейзажу, паколькі ім давялося жыць у маляўнічай сядзібе “Каралінскі фальварак Тызенгаўза”, дзе імі былі пасаджаны яблыня і груша — першыя дрэвы будучай алеі. Акрамя таго, удзельнікі пленэру пабывалі ў Навагрудку, Лідзе, Гальшанах, Крэве, Жыровіцкім манастыры. Цікавасць у гасцей замежжа выклікала наведанне Майстэрняў членаў Беларускага саюза мастакоў.

Дар’я ЧАРКЕС
Гродна

Н.Шчасная. “Нэлі, Лада, Ніка”.

Пра тых, хто “адыходзіць” і “слухае”

Вясёлкавая **віхура**

“Я пішу дотыкам колераў”, — кажа заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Нінэль Шчасная, выстаўка твораў якой адкрылася ў Светлагорскай карціннай галерэі “Традыцыя” імя Германа Пранішнікава.

І сапраўды, многія карціны Нінэль Іванаўны нібыта сатканы з асобных кропелек колераў. Шматслаёвасць фарбаў спрыяе адчуванню паветранасці, зіхацення, рухавасці. Раптам здзіўлена заўважаеш, што ў іх ёсць аб’ём, але няма ліній. Вось чаму ейныя творы быццам бы ўзнікаюць з паветра і знікаюць у ім. Здаецца, што яны і напісаны на… паветры.

У 1998-м годзе, калі мастачка ўпершыню завітала са сваёй выстаўкай у Светлагорск, я выказаў ёй гэтае адчуванне. Яна ўсміхнулася ў адказ: “Кожны мастак павінен рабіць тое, чаго няма. Толькі тады ён не рызыкуе быць другасным”. Час пацвердзіў, што сваімі творчымі прынцыпамі Нінэль Шчасная не паступілася ні ў адным з 23 твораў, прадстаўленых на гэтай выстаўцы.

Экспазіцыя адкрываецца аўтапартрэтам. Мы бачым мастачку ў яе знакамітай вязанай шапачцы. Пяшчотна прыжмураныя вочы прыветліва ўзіраюцца ў нас. Затоеная ўсмешка. Яскравая мудрасць. Не, партрэт — гэта не толькі знешняе падабенства. Ён жыве, а не пазіруе свайму ўвасабленню. “Лада слухае…” — называецца адзін з іх. І нават калі б не было гэтага подпісу, адчуванне засяроджанай добразычлівай увагі перададзена з такой псіхалагічнай дакладнасцю, што зноў узгадваем магічную сілу майстэрства мастачкі. Прасветлены настрой зыходзіць з гэтай карціны. Ён — не толькі ў адухоўленай прыгажосці дзяўчыны, але і ў цнатліва-белай прасторы кветак, якія фрагментарна выяўляюць нешта больш значнае, чым тое, што бачым. Паэтычны падтэкст? Так, у творах Нінэль Шчаснай ён прысутнічае заўсёды. Напісаць тое, што не напісана, — гэта ўжо звышталент і звышмайстэрства.

І яны цалкам праявіліся ў таксама пранізліва-псіхалагічным настроі аўтапартрэтнай імправізацыі “Адыходзяць…”. Вясёлкавая віхура паветра, у якой, малітоўна склаўшы рукі, усхваляваная жанчына глядзіць услед тым, хто ўжо знік за межамі карціны. Нават у чыста ілюстрацыйнай, на першы погляд, рабоце “Яшчэ адна вясна майго бацькі” раптам заўважаеш у постаці садоўніка такую адметную характэрнасць, што міжволі разумееш, з якой цяжкасцю даюцца яму гэтыя вёсны. Але, стоячы ля яблыні, некалі пасаджанай ім, ён і сам нібыта расце, імкнецца ў веснавое неба…

Уражвае (і не толькі кампазіцыйнай арыгінальнасцю) вертыкальны трайны партрэт “Нэлі, Лада, Ніка”. Адразу ж адчуваеш зрокам нейкую спавядальную пераемнасць духоўнай прасветленасці такіх роднасных твараў. А побач — яшчэ адно ўвасабленне Нікі ў аднайменнай карціне, якую так і хочацца назваць “Тварам усмешкі”. Побач — “Александроўская з сынам”, “Пад засенню звона”, “Сяргей Неўмывакін” — такія розныя, па-свойму адметныя, прасякнутыя тонкім псіхалагізмам творы. Дарэчы, у іх Нінэль Шчасная не жадае хаваць сваіх адносін да тых, каго малюе. Яна нават можа зрабіць партрэтам… пейзаж. Дарэмна будзем шукаць у ім рэальнае ўвасабленне таго ж Неўмывакіна, хаця прысутнасць яго нават больш чым адчуваецца.

А ўвогуле ўся экспазіцыя такая кветкава-яркая, вясёлкава-прасветленая, што міжволі прыгадваеш яе назву, падказаную агульным адчуваннем: “Жанчыны-лілеі”. Менавіта гэтая кветка з біблейскіх часоў лічыцца сімвалам чысціні і мае дачыненне, перш за ўсё, да Дзевы Марыі. І ці трэба здзіўляцца, што белыя цнатлівыя прыгажуні прысутнічаюць ледзь не ў кожным творы светлагорскай экспазіцыі. Выключэннем з’яляюцца хіба што “Дзьмухаўцы”. Але якое майстэрства спатрэбілася, каб напісаць гэтыя бязважкія кветкі побач з камянямі! Пераканаўчы кантраст лёгкасці з цяжарам — жыццёвы спрадвечны сімвал. Аднымі, хай сабе і цудадзейнымі, дотыкамі колераў гэтага не зробіш.

А ў суседняй зале нашай галерэі адначасова экспануюцца 26 твораў яе дачкі Лады. На вялікі жаль, гэта яе пасмяротная выстаўка. Выхаванка Мінскага мастацкага вучылішча, яна скончыла і Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, але больш за ўсё, відаць, вучылася ў маці. І пераемнасць гэтая добра адчуваецца: тая ж святочнасць фарбаў, тое ж выдатнае майстэрства псіхалагічна дакладных партрэтных увасабленняў... Кожнае з іх — таксама з падтэкстам: “Адвярнуўся…”, “Партрэт сябра”, “Перачытваючы Аскара Уайльда”, “Пасля свята”… У палатне “У чаканні цябе” яна імкнулася напісаць не проста партрэт спявачкі, але і ейны голас, перадаць фарбамі адчуванне чакання. Творчая спадчына гэтай надзвычай таленавітай мастачкі патрабуе асобнай размовы.

Больш за сорак персанальных выставак на творчым рахунку Нінэль Шчаснай, а такая — сумесная з дачкой — адна з першых.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ
Светлагорск

Н.Шчасная. “Валошкі”.

Нядаўна ў мінскай галерэі “Мастацтва” прайшла выстаўка жывапісца-лірыка Віктара Каралёва. Яна была даволі сціплая, змясціўшы ў сабе толькі невялікую частку яго творчага даробку. Але і па гэтай экспазіцыі можна меркаваць аб тым, чым жыве мастак-пленэрыст, якія думкі і пачуцці яго апаноўваюць, што яго хвалюе, што радуе, як ён успрымаў свет учора і якім хоча бачыць яго сёння.

Аронава Слабада
і барвовае золата

В.Каралёў. “Сад”.

Дык што такое жывапіс Віктара Каралёва? Канешне, гэта, перш за ўсё, — музыка беларускай прыроды. Усе пейзажы — ціхія, ураўнаважаныя, спакойныя: першая зеляніна, лясная дарога ў роднай Аронавай Слабадзе, рака Чарняўка і надыход вясны, шмат зім і сонечных дзён…

Творцу прываблiваюць моманты, калі сонца толькі пачынае заходзіць, калі вецер ледзь-ледзь варушыць бярозавае лісце або засыпае зямлю восеньскім барвовым золатам. На палотнах Каралёва не грукочуць навальніцы, не бурліць тэмперамент, не чуваць блытанай гучнай споведзі або поступу мастакоўскага пафасу. Але гэтае нейкае “звужэнне” эмацыйнага дыяпазону — рамкі індывідуальнага ўспрыняцця, свайго роду “правілы гульні”, што разумее глядач, які знудзіўся па пачуццёвым чалавечым мастацтве і якому, па праўдзе кажучы, трошкі паднадакучыў так званы беспрадметны авангардны жывапіс.

Мастак не прэтэндуе на нейкае “наватарства” сваіх вобразна-пластычных пошукаў. Ён — лірычны паэт, для якога родная прырода — усё, і творца ад гэтага атрымлівае асалоду. Хаця я ведаю Віктара Іліядоравіча і як адоранага партрэтыста і майстра нацюрморта. Напрыклад, партрэтную кампазіцыю “Усё было…” лічу вельмі ўдалым палатном В.Каралёва, дзе пранізліва прасочваецца няпросты лёс чалавека, які прайшоў вайну…

Б.К.

Гэта была апошняя, красавіцкая, выстаўка Мікалая Казлова, якая паспяхова прайшла ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Было ўжо вядома, што Мікалай цяжка хворы, але хто мог паверыць у найгоршае? Калі працуе, выстаўляецца — значыць, не так ужо ўсё дрэнна. Нават на вернісажы, калі мастака, нязвыкла бледнага і схуднелага, незаўважна падтрымліваў сын Раман, усё яшчэ цеплілася надзея. Але ёй не наканавана было спраўдзіцца…

Уласная рэальнасць

Мікалай Казлоў. Тварыў толькі тое, што падабалася...

Адной з самых важных спраў у жыцці для Мікалая Казлова было афармленне кніг. Выхаванец Маскоўскага паліграфічнага інстытута, ён вельмі высока цаніў мастацтва кніжнай графікі і стараўся ўнесці ў яго свой асабісты ўклад. Вынікам стала цэлая бібліятэка — звыш 150 кніг, якія Мікалай Раманавіч аформіў самастойна ці разам з жонкай Наталляй Суставай. І якія гэта кнігі! Класічныя “Рабінзон Круза” Д.Дэфо, “Казкі” Э.-Т.-А. Гофмана, “Прыгоды барона Мюнхаўзэна” Э.Распэ, “Аліса ў Краіне цудаў” Л.Кэрала, “Рубаі” А.Хаяма, “Пунсовая кветачка” С.Аксакава, а таксама — сучасных беларускіх аўтараў. На ўсё хапала энергіі, фантазіі і майстэрства. А колькі кніг М.Казлова было адзначана вышэйшымі дыпломамі і ўзнагародамі ў Беларусі і на многіх міжнародных конкурсах кнігі!

М.Казлоў. З серыі “Фантазус”.

Мікалай Раманавіч больш за 15 гадоў працаваў галоўным мастаком выдавецтваў “Мастацкая літаратура” ды “Юнацтва”, і дзякуючы, у тым ліку, яму яны сталі своеасаблівай творчай лабараторыяй па распрацоўцы вобраза сучаснай дзіцячай кнігі. Менавіта тут адточваліся наватарскія ідэі макетавання і паспяхова ўвасабляліся смелыя праекты ілюстравання. А якія цудоўныя школьныя падручнікі ад Казлова і Суставай! Яркія, жывыя, інфарматыўныя, па іх цікава вучыцца, іх вельмі прыемна нават проста гартаць. Кожная старонка мае сваіх герояў — вясёлых і адважных, смелых і добрых. Каштоўнасць гэтых ілюстрацый яшчэ і ў тым, што яны выконваюць сэнсавую нагрузку нароўні з вучэбнымі параграфамі. Узнікае прамая пераемнасць пакаленняў, калі культура адлюстравання з рук мастакоў перадаецца ў рукі юнага гледача і чытача.

Не менш важкі ўклад Казлоў унёс у станковую графіку. Тут трэба перш за ўсё згадаць яго шыкоўныя серыі “Вігілія”, “Фантазус” і самую апошнюю — “Тонда”: гэта высокая культура адлюстравання, дасканалае пачуццё кампазіцыі, высакародныя стрыманыя тоны з нячастымі яркімі ўкрапваннямі, з выразна прарысаванымі лініямі…



Мікалай Казлоў.

Немагчыма пісаць пра Мікалая Казлова: “быў”, “працаваў”. Розумам усведамляем, а сэрцам — не. Сышоў Майстар, але засталіся ягоныя творы, яго вобразна-пластычныя светы як спосаб выражэння таленавітага і яркага мастака, які стварыў сваю ўласную рэальнасць…

Кацярына КЕНІСБЕРГ

Опера ў шляхетным атачэнні — справа звыклая. А ў фальклорным? "Чароўная ноч класікі ў музеі пад адкрытым небам" прайшла ўпершыню ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. І не расчаравала!

Страчыце ноты ў Строчыцы

Ноч у скансене

Яно і зразумела: лета і свежае паветра — паняцці непадзельныя. А калі яшчэ дадаць сюды і музыку! Таму чэрвень так багаты на канцэрты і спектаклі пад адкрытым небам. Учора-сёння-заўтра ў Нясвіжы — "Вечары Вялікага тэатра Беларусі ў замку Радзівілаў". Днямі прайшлі традыцыйныя "Музычныя вечары ў Мірскім замку", што транслюе АНТ. Адзін з іх, прысвечаны старадаўнім рамансам, правялі салісты і аркестр Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Літаральна ж напярэдадні артысты гэтай трупы разам з запрошанымі спевакамі, у тым ліку з Масквы і Санкт-Пецярбурга, стварылі "Чароўную ноч класікі" ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, які многія ведаюць па назве вёскі, што знаходзіцца непадалёк, — Строчыца.

Каб усё адбылося, адной ідэі было замала. Вялікую падтрымку аказалі Міністэрства культуры краіны, Мінгар- і Мінаблвыканкамы. У будучым такі "музычны пленэр Музычнага тэатра" павінен пашырыцца да некалькіх вечароў запар. Бо акустычныя ўмовы на музейным полі — выдатныя. Ледзь пачалася рэпетыцыя, усе адразу заўважылі, як па-асабліваму гучаць на адкрытым паветры духавыя: ну проста ў сваёй стыхіі! І — як увогуле пасуе краявідам любая добрая музыка.

Канцэрт шмат у чым можна было назваць эксперыментальным, зробленым у парушэнне звыклых правілаў "спеўна-гасцявога прыёму". Замест формулы "гасцей — на дэсерт, бо інакш публіка разбяжыцца", запрошаныя салісты выступалі ў пачатку, адразу задаўшы найвышэйшую планку. Дый падбіралі гасцей зусім не паводле распаўсюджанага прынцыпу: "А нашы зоркі на іх фоне — мега-супер!". Салістка Марыінскага тэатра, лаўрэат міжнародных конкурсаў Ларыса Юдзіна паказала такі клас, што нават самыя заўзятыя аматары кпінаў вымушаны былі пагадзіцца: гэта — бездакорна! Уразілі не толькі яе віртуозныя каларатуры, але і тое, як змяняўся сам тэмбр ейнага голасу ў залежнасці ад музыкі: у "Салаўі" А.Аляб'ева адчуваліся галасы прыроды, у арыі Царыцы Ночы — бліскаўкі металу, а ў "Казках Венскага лесу" І.Штраўса — какетлівыя рэверансы балю.

Сярод запрошаных салістаў Вялікага тэатра Беларусі канчаткова скарыў Станіслаў Трыфанаў. Да імгненных пераўвасабленняў таго ж Эдуарда Мартынюка, які некалькі гадоў таму змяніў Музычны тэатр на Вялікі, усе ўжо прызвычаіліся. С.Трыфанаў, здавалася б, зрабіў на гэтай вечарыне зваротны крок: з оперы ў аперэту. Выйшаўшы спачатку Тарэадорам з "Кармэн" Ж.Бізэ, ён хутка, без аніякіх аперэтачных штампаў, пераўвасобіўся ў графа Аманая з "Цыганскага барона" І.Штраўса і ў падвыпіўшага гусара, пра якога той спявае. І ўсё — на выдатным оперным вакале, як і павінна быць у класічнай аперэце.

Адлюстраваў канцэрт і іншыя "праблемныя зоны" Музычнага тэатра. Адну з іх можна было б выявіць вядомай аперэтачнай назвай: "Патрабуецца гераіня!". У прыватнасці — Сільва. Хаця гэтую партыю спяваюць ажно чатыры салісткі тэатра, "другой Наталлі Гайды" (і гэта добра было бачна на канцэрце) сярод іх пакуль няма. Можа, "другая" і не патрэбна! Але патрэбна такая ж яркая індывідуальнасць, здольная замяніць традыцыйны меладраматызм і напластаваныя жанрам штампы на сапраўдную моц характару. Так, як гэта робіць у кожнай сваёй ролі тая ж Леся Лют. Выявіліся і "мужчынскія" вакальныя недахопы: параўнаўшы сябе з зоркамі, многім было над чым задумацца. І вызначыць, куды трэба рухацца надалей! Падобна на тое, што такая "шокатэрапія", нябачная для шырокага кола гледачоў, становіцца творчым крэда мастацкага кіраўніка тэатра Адама Мурзіча: ён планамерна, праграму за праграмай, "сутыкае" сваіх салістаў з зоркамі сусветнага ўзроўню, ствараючы своеасаблівыя "майстар-класы".

Гэта, дарэчы, нікольки не перашкаджае прызнанню "сваіх": на той жа вечарыне ў Строчыцы Віктар Цыркуновіч быў урачыста ўзнагароджаны дыпломам Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры "Лепшы акцёр года".

На здымках: Станіслаў Трыфанаў; артысты тэатра на open-air.
Фота Ларысы САЛОДКІНАЙ

Але ж самым нечаканым адкрыццём стаўся наш аркестр, прынамсі, калі ім кіраваў амерыканскі дырыжор Філіп Сіманс. Ён прыехаў да нас вырашаць пытанні з будучай пастаноўкай мюзікла "Вестсайдская гісторыя" Л.Бернстайна. Дык чаму б не пазнаёміцца з трупай бліжэй? Тым больш, што менавіта Ф.Сіманс будзе дырыжорам- пастаноўшчыкам будучай гучнай прэм'еры, запланаванай на наступны сезон. Побач з госцем у канцэрце ўдзельнічалі чацвёра нашых дырыжораў, прычым усе — выхаванцы нашай беларускай школы. Нашы дырыжоры надавалі максімум увагі знешнім праявам: выразнасці рук, эмацыйнасці твару, намагаліся не пакінуць без свайго удзелу ніводнай ноты. Госць жа, на першы погляд, зусім не карпацеў, змахваючы пот ад цяжкой працы, — наадварот, толькі і рабіў, што радаваўся жыццю і музыцы, зараджаючы ўнутранай энергетыкай астатніх. Але як зазіхацелі вядомыя творы! Бо ў кожным замест аднолькавых па значнасці нот і фраз з'явіўся лагічны і просты падзел на "падзеі" і "фон". Практычна без аніякіх залішніх рухаў! Дык, можа, і нашых дырыжораў трэба часцей накіроўваць у Санкт-Пецярбург? Бо менавіта тамтэйшую школу прайшоў амерыканскі госць, які лічыць сваім кумірам і галоўным настаўнікам Юрыя Цемірканава.

Клас ад вершніка

23 чэрвеня бенефісам Людмілы Кудраўцавай у балеце "Сільфіда" Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі завяршыў свой 78-ы сезон. Яго вынікі падводзіць галоўны дырыжор тэатра, заслужаны артыст Украіны Віктар ПЛАСКІНА:

— Сезон быў адзначаны цудоўнымі пастаноўкамі: страсная "Тоска", мужны "Трыстан...", язычніцкая "Снягурка", паветраная "Сільфіда", манументальная "Аіда". На Калядным форуме ўсе музычныя крытыкі і госці ў адзін голас адзначылі высокі ўзровень калектыву. Я ганаруся! Мы паспяхова сыгралі Трэцюю сімфонію Рахманінава і Скрыпічны канцэрт Сібеліуса. Хочацца ўзгадаць "Мадам Батэрфляй" з Шарубінай. Гэтая "маленькая Ніна" дорыць сваю душу, моцны характар і багаты тэмбр голасу. У апошнім спектаклі "Тоскі" ашаламляльна спяваў Уладзімір Пятроў: прыроджаны арыстакратызм, упэўненасць, выдатная дыкцыя! Да глыбіні душы кранае сцэна Каварадосі — Сяргея Франкоўскага, калі той рыдае, малюючы вобраз каханай. Цёплыя словы на адрас галоўнага рэжысёра — Міхаіла Панджавідзэ. З яго з'яўленнем у тэатры сцэна стала, бы мурашнік. Узрушаюць яго глыбокае веданне матэрыялу, зладжанасць дзеянняў і іскрамётная фантазія. У "Князі Ігары" мяне ўзрадаваў хор. Такой аддачы, тэмбральнай напоўненасці я даўно не чуў. За што я люблю "Хаваншчыну"? Мусаргскі — геній, прарок рускага народа. Шаклавіты Станіслава Трыфанава гаворыць ад імя народа, ды так, што ўся гісторыя, падаецца, праходзіць перад вачыма, і мароз ідзе па скуры ад яго прадвесцяў. Не даюць заснуць "Салаўі" Эдуарда Мартынюка на канцэрце "Дарогі вайны", якія мы прайшлі таленавіта і пранікнёна.

Працуючы над пастаноўкай "Сільфіды" з вопытным харэографам Далгушыным, я атрымаў агромністы вопыт класнай балетнай працы. Для мяне было вялікім кампліментам, калі ўсе ў адзін голас казалі, што дырыжор і балет — адно цэлае. Да гэтага я і імкнуўся. Роля дырыжора — весці за сабой, быць камандзірам, вершнікам, але не без галавы. Цяпер як ніколі тэатру патрэбна працягваць працаваць з дальнабачнасцю, неабходна моцная заяўка, праграма на будучыню. Неабходна, лічу, не страціць маштабу, набранай вышыні. Трэба "звездеть", выпускаць моцныя "ракеты". Трэба зразумець, што будучыня тэатра — ужо ў цяперашнім дні. Гэтым я жыву і "хварэю".

Фота Юрыя ІВАНОВА

Дык хто там ідзе?

Выпускны іспыт навучэнцаў Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа на сапраўднай тэатральнай сцэне і, найперш, у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі даўно ўжо стаў традыцыяй.

Звыклым стаў і паказ на такіх справаздачах "Дон Кіхота" Л.Мінкуса, бо ў гэтым балеце, што мае безліч рэдакцый (ад чатырох- да аднаактовай), ёсць дзе разгарнуцца выхаванцам абодвух аддзяленняў: і "класікам", і "народнікам". Ды ўсё ж сёлетні спектакль нават на такім "шматгадовым" фоне не толькі не згубіўся, але і дазволіў без аніякіх пераболшванняў перайначыць паэта: "Моладзь ідзе! Моладзі — дарогу!"

Быў у каледжа такі момант, калі, здавалася, традыцыі добрага навучання класіцы пачыналі сыходзіць у нябыт. Бо ў характарных танцах і сучаснай харэаграфіі мы бачылі добра падрыхтаваных юных артыстаў, класічны ж кірунак адразу выкрываў "брыдкіх качанят", што не паспелі ператварыцца ў "лебедзяў". Цяперашні "Дон Кіхот", насупраць, уразіў якраз адточанай, "вышкаленай", у лепшым сэнсе слова, класікай. Бо пастаноўка трымалася не на адной пары салістаў, да якой "у нагрузку" чапляўся блякла-ніякаваты кардэбалет, а на зладжанай камандзе, у якой падзел на "герояў" і "масоўку" не толькі другасны, але і ўвогуле непатрэбны, бо там ледзь не кожны — саліст, які ўмее цудоўна выступаць у ансамблі, вытрымліваючы роўнасць ліній і сінхрон. Адразу сярод некалькіх дзяўчат, якія выходзілі з адной-дзвюма варыяцыямі, можна было ўгледзець будучых прымадоннаў — пры ўмове, што праца ў тэатры стане для іх чарговай прыступкай навучання і, галоўнае, знаходжання ўласнай творча-пластычнай індывідуальнасці. Калі раней, бывала, бракавала статных хлопцаў, якія валодалі б не толькі сольнымі па, але і падтрымкай партнёршы, дык цяпер і тут адчуваўся прарыў. На таго ж Ігара Субоціна ў партыі Базіля, пэўна, заглядалася не адна салістка балета, не кажучы ўжо пра ўдзячную публіку.

У некаторых нумарах, вядома, на першы план выходзілі стараннасць, руплівасць, адданасць, да якіх вельмі хацелася далучыць яшчэ і тэатральную разняволенасць. Але чым больш доўжыўся спектакль, складзены ў двухактовы варыянт, тым больш запалу (а зусім не стомленасці!) з'яўлялася ў юных артыстаў. Дык няхай так будзе і надалей!

Фота Івана ЗАХАРАВА

Тройчы залатыя лялькі

"Халстамер" прывёз Гран-пры!

Літаральна днямі артысты Брэсцкага тэатра лялек вярнуліся з Прагі, дзе прымалі ўдзел у юбілейным, XV Сусветным фестывалі тэатраў лялек. Як сцвярджаюць самі арганізатары фэсту, брастаўчане здзейснілі сапраўдны цуд: забралі амаль усе ўзнагароды, уключаючы Гран-пры форуму!

Погляд з Прагі...

Па выніках творчага форуму нязменны дырэктар Сусветнага фестывалю лялечнага мастацтва ў Празе і вядомы тэатральны дзеяч Чэхіі Род ПЕТРАВІЧ даслаў брэсцкім лялечнікам ліст, у якім, у прыватнасці, піша: "Сёлета на нашым фестывалі прысутнічалі ўдзельнікі і госці з 37 краін свету. І ўсе яны былі ўражаны вашым спектаклем "Халстамер". На іх погляд, ён сёння з'яўляецца адной з найлепшых пастановак у свеце, а ваш тэатр уваходзіць у лік тэатральнай эліты. І гэта вы падцвярджаеце цягам доўгага перыяду. Варта ўзгадаць першую перамогу ў Празе ў 2006 годзе і Гран-пры, заваяваны летась спектаклем "Месяц Сальеры". Сёлета тэатр трэці раз атрымаў Гран-пры і яшчэ тры ўзнагароды. Такога поспеху за ўсе 15 гадоў існавання пражскага фестывалю не меў ніводзін тэатр-удзельнік!"

Акрамя таго, Род Петравіч накіраваў лісты падзякі на адрас міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі і губернатара Брэсцкай вобласці Канстанціна Сумара.

— Часам погляд збоку дапамагае лепш убачыць і ацаніць свае дасягненні, — *распавёў спадар Петравіч у тэлефоннай размове.* — Таму я лічыў неабходным падзякаваць за падтрымку цудоўнага калектыву з Брэста, бо дасягненні вашых лялечнікаў — вялікія і бясспрэчныя. Я ведаю гэтых творцаў цягам ужо шасці гадоў, і смела магу так казаць. Важна, што яны ўдасканальваюць сваё майстэрства, дасягаюць новых вяршынь. А гэта — зарука далейшых поспехаў і здзяйсненняў.

— Вы з'яўляецеся мастацкім кіраўніком Сусветнага карнавалу лялечнага мастацтва, які ўвосень будзе ўпершыню праходзіць у Казахстане…

— Перада мной пастаўлена задача: запрасіць на яго лепшыя тэатры лялек з усіх кантынентаў. І адно з першых запрашэнняў я накіраваў у Брэсцкі тэатр. Мне хацелася, каб гэты грандыёзны фэст у Алма-Аце адкрыў менавіта ваш спектакль "Халстамер". Але ўдзел брэсцкага калектыву ў Сусветным фестывалі ў Францыі, які таксама праходзіць у верасні, прымусіў мяне ўнесці яго ў праграму карнавалу на больш позні час. Зрэшты, гэта не істотна, бо галоўнае — пастаноўку павінны ўбачыць новыя гледачы якія, спадзяюся, высока ацэняць дадзены твор. Наогул, лічу, Беларусь мае права ганарыцца тым, што ў яе ёсць такія калектывы, як Брэсцкі тэатр лялек, які годна прэзентуе ваша мастацтва за межамі сваёй краіны. Без яго спектакляў і сусветнае мастацтва было б нашмат бяднейшым.

...і з Брэста

— Скажыце, — *звяртаюся да дырэктара Брэсцкага тэатра лялек Міхаіла ШАВЕЛЯ,* — **у чым жа сакрэт такога міжнароднага поспеху тэатра?**



— Трэба настойліва працаваць і ставіць сабе мэту. Гэта датычыцца і выбару матэрыялу для пастаноўкі, і тых цікавых творцаў, якія могуць неардынарна прачытаць іх, даць сцэнічнае жыццё класічным творам, што да гэтага, магчыма, было цяжка ўявіць у лялечным тэатры.

— Упершыню вы прынялі ўдзел у Сусветным фестывалі тэатраў лялек у 2006-м са спектаклем "Халстамер". Як вітала вас фестывальная публіка?

— Так, у той год у Прагу з'ехаўся 41 тэатр з 32 краін свету! І ўсе тэатры — носьбіты самабытных лялечных традыцый, прадстаўнікі разнастайных школ і накірункаў. Натуральна, што, нават нягледзячы на наяўнасць у нашай пастаноўкі досыць вядомай фестывальнай гісторыі, мы ўсё роўна хваляваліся, бо яшчэ ніколі не бачылі такой канкурэнцыі. Аднак перапоўненая добразычлівая зала дапамагла настроіцца на працу, і ў выніку той спектакль (як, зрэшты, і ўсе пазнейшыя) прайшоў выдатна. Мы, проста, у адзін момант адчулі, што не застанемся без узнагароды. І адчуванні гэтыя — спраўдзіліся: праз дзень пасля вяртання дадому ў тэатр патэлефанавала прадстаўніца нашага пасольства ў Чэхіі і павіншавала з перамогай — атрыманым Гран-пры.

— Калі ў 2010 годзе Брэсцкі тэатр лялек прапанаваў аргкамітэту чарговага фестывалю ў Празе спектакль "Месяц Сальеры", ён ужо ведаў яго ўзровень і маштабы...

— Натуральна, мы павінны былі трымаць марку. І тое, як прайшоў спектакль, як ён быў успрыняты гледачамі, засведчыла: калектыў выпрабаванне вытрымаў! У нас з'явілася шмат новых прыхільнікаў і шчырых сяброў. Гэта мы асабліва адчулі па бурных апладысментах залы, якія раздаліся ў момант аб'яўлення рашэння журы: Гран-пры фестывалю ў другі раз уручаецца Брэсцкаму тэатру! Прэзідэнт форуму Тодар Рысціч мусіў доўга чакаць, пакуль сціхнуць авацыі, каб аб'явіць, што тэатр з Брэста са спектаклем "Халстамер" як двойчы пераможца запрашаецца на наступны, юбілейны, XV фэст, які збярэ ўсіх пераможцаў ранейшых гадоў.

— Зноў — "Халстамер": лёс гэтай пастаноўкі, якая неаднойчы прэзентавала айчыннае лялечнае мастацтва, сам па сабе незвычайны і ў многіх момантах паказальны…

— Менавіта так. Спектакль гэты жыве і развіваецца цягам усяго свайго існавання. Прыкладам, гэтай вясной, рыхтуючыся да паездкі ў Прагу, мы зноў запрасілі рэжысёра Руслана Кудашова, каб ён увёў на ролю Халстамера новага выканаўцу — Уладзіміра Тэвасяна. І Руслан як чалавек вельмі творчы літаральна за некалькі рэпетыцый прыўнёс шмат новых выяўленчых сродкаў у саму пастаноўку, зыходзячы з акцёрскай індывідуальнасці выканаўцы, расставіў новыя акцэнты, і спектакль загучаў яшчэ больш пранізліва, драматычна. І, акрамя Гран-пры, атрымаў у дадатак тры дыпломы: за лепшую рэжысуру, сцэнаграфію і музычнае афармленне. У такія моманты кожны ўдзельнік калектыву адчувае гонар не толькі за свой тэатр, але і за тое, што ён прадстаўляе беларускае мастацтва.

Рыгор БАКІЕВІЧ
Брэст

На здымках: артысты тэатра ў Празе; сцэна са спектакля "Халстамер". Фота аўтара і Станіслава КОРШУНАВА

Чаму маўчаць званочкі?



Айчынны тэатральны асяродак ужо якое дзесяцігоддзе зачараваны пастаноўкамі літоўскіх калег. Тэатр, які адмаўляецца ад залішняй вербальнасці на карысць амаль язычніцкіх абрадаў і неўтаймаванага сімвалізму, збірае паўнюткія залы. На гэтай хвалі беларускія падмосткі раз-пораз папаўняюцца спектаклямі рэжысёраў з суседняй краіны ці пастаноўкамі па літоўскім матэрыяле. Цяпер дакрануцца да атмасфернай тэматыкі прапанаваў сталічны Новы тэатр: напрыканцы сезона тут прэзентавалі "Бляск летняй вады" па п'есе Лаўры-Сінціі Чарняўскайтэ.

Як бачна, Новы тэатр працягвае папаўняць рэпертуар творамі маладых, але ўжо заявіўшых пра сябе драматургаў, якія яшчэ не ставіліся ў Беларусі. Такім чынам ён не толькі далучае да плыні сучаснай сусветнай драматургіі свайго гледача, але прапануе і прафесіяналам адкрыць для сябе новае перспектыўнае імя.

Прынамсі, Лаўра-Сінція Чарняўскайтэ стала вядомая ў 2000-х: хваля пастановак па яе першай п'есе пракацілася па расійскіх тэатрах і закранула фестывальны "М.@rt.кантакт". Рэжысёр-пастаноўшчык Віргінія Тарнаўскайтэ звярнулася да наступнага твора маладой аўтаркі.

Мастак-пастаноўшчык Яўген Волкаў імкнуўся перадаць містычнаць дзеі, аб'яднаўшы ў адзіную прастору інтэр'ер з экстэр'ерам: майстэрня скульптара Бэна адначасова з'яўляецца і пірсам ля загадкавай ракі, дзе яго дачка Базіле размаўляе з Рыбай — старажытнахрысціянскім увасабленнем Бога. Вось толькі сімвалічная хованка-храм дзяўчынкі чамусьці не аздоблена ў неабходнай колькасці званочкамі. Большасць тых высокіх пруткоў-рыб, якія, паводле рэжысёрскай задумы, павінны адгукацца тонкім звонам, што ачышчае ад наносных крыўд, вызваляе ад цяжару комплексаў і загойвае сардэчныя раны, у кульмінацыйных момантах душэўнага напружання… маўчаць. Так з-за дробязі, на якой завязана палова дзеяння спектакля, парушаецца тая самая атмасфера, што вызначае поспех такога кшталту тэатра.

Рэжысёр Віргінія Тарнаўскайтэ выкладае ў Тэатральнай школе № 1, якая з'яўляецца структурным падраздзяленнем Новага тэатра. Верагодна, таму акцёрскі ансамбль будаваўся вакол адзінаццацігадовай навучэнкі ўстановы Валерыі Сакаловай. Сапраўды, маленькай актрысе ўдалося стварыць вобраз загнанай у клетку свайго болю дзяўчынкі, што "пачувае сябе гадоў на дзвесце: старой, замаруджанай і ўсім абавязанай". Але агульнае адчуванне знаходжання на краі прорвы можа з'явіцца толькі тады, калі дзіцячую арганічнасць адценяць прафесійныя акцёры.

Большасць жа артыстаў, аддаўшы першую скрыпку школьніцы, быццам бы зусім зніклі з палітры спектакля. Пакінуўшы на водкуп метафарычнасці пункцірныя праходкі па сцэне напрыканцы ці на пачатку мізансцэн, яны паплылі па волі той самай летняй вады і не сталі заглыбляцца ў псіхалагічныя партрэты сваіх герояў. Прынамсі, бацька галоўнай гераіні — Бэн у выкананні Валерыя Агаяна — так і застаўся плоскаснай фігурай у дзіцячым расповедзе. А шкада, бо тэкст Лаўры-Сінціі Чарняўскайтэ змяшчае нямала зачэпак для заглыблення ў матывацыю ўчынкаў герояў. Побытавая, на першы погляд, гісторыя можа пераўтварыцца ў разважанне пра дарослых, якія, песцячы свой эгаізм, вымушаюць дачок і сыноў на парозе жыцця па-дзіцячы прагна жадаць смерці.

Базіле ў вострыя муры адзіноцтва заганяе маці, якая на вачах у дачкі заканчвае жыццё самагубствам, бо не змагла знайсці кампраміс паміж каханнем да сяброўкі і пачуццямі да мужа, ад якога нарадзіла дзіця. Сваю "цагліну ў сцяну" дадае бацька, замкнёны ў спробах ухапіць здань памерлай жонкі. Былая сяброўка маці, закаханая ў Бэна маладая настаўніца, ды шматлікія хворыя хадакі ўспрымаюць школьніцу толькі ў якасці прадмета для дасягнення пастаўленых мэт. Пабачыць жа акрываўленыя камяні ў сваёй руцэ, адчуць чужы боль і паспрабаваць думаць не толькі пра сябе, але і пра тых, хто цябе любіць, — гэтаму ўсяму і вучацца героі цягам усёй дзеі ў загнанай знутры сваёй "нікому непатрэбнасцю" дзяўчынцы…

Настасся ПАНКРАТАВА

На здымках: сцэны са спектакля. Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Вольга Страх.

Таццяна Давыдзенка з кіраўніком дыплома Русланам Найдзіным.

Настасся Бачыла прэзентуе свой праект.

Кропка інсайту

Абарона дыпломаў у шасці рэцэнзіях

Апошнія дні чэрвеня штогод становяцца яшчэ гарачэйшымі, калі ў студэнцкіх аўдыторыях віруе абарона дыпломаў. А калі дыпломнікі — носьбіты творчых прафесій? А калі яны фатографы, хто, можна сказаць, літаральна ўчора схапіў нечаканы, але такі жаданы інсайт? Карацей, уявіце сабе кропку кіпення крэатыву і творчай думкі, што панавала ў час абароны дыпломаў выпускнікамі факультэта дызайну і ДПМ Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Рэцэнзентам работ шасці выпускніц запрасілі выступіць мяне. Так і нарадзіліся гэтыя фрагменты з нататак на палях рэцэнзій.

Міла, або Злітнасць з мадэрнам

Фотаздымкі, прадстаўленыя Мілай Зверавай, цікавыя сваёй незвычайнасцю. І не толькі таму, што яна абмежавала сябе тэхнікай перадачы выявы (пінхол — сваячка камеры абскура), а ў яе работах (я назваў бы іх нават творамі мастацтва) праглядаецца дачыненне, злітнасць з мадэрновай беларускай паэзіяй.

Н.Кашэўская. З календара, прысвечанага работам студэнтаў кафедры ДПМ.

Н.Бачыла. З праекта "Людзі, якія працуюць у маленькіх прасторах".

Т.Давыдзенка. Плакат з сацыяльнага фотапраекта.



В.Страх. Партрэт У.Вішнеўскага.

Не так шмат прыкладаў, калі фатаграфія ілюструе мастацкія творы. А ў дыпломнай працы прадстаўлена даследаванне тэмы і прыведзены прыклады з сусветнай практыкі. Гэта сведчыць аб сур'ёзнай падрыхтоўцы Мілы Зверавай да вырашэння праблемы ўдзелу дызайн-фатографаў у дзейнасці выдавецтваў.

Тым не менш, мне пакуль цяжка сказаць, дзе знойдзе прымяненне гэтая выдатная экспазіцыя. Сама ж Міла Зверава падобная на сябе, і будучыня — у ейных руках. Дыпломная праца заслугоўвае найвышэйшай адзнакі.

Таццяна, або Не прыдуманая гісторыя

Выбар Таццянай Давыдзенка тэмы ўласнай дыпломнай працы — рэальны. Здымка ж у начны час — вынік прафесійнага валодання фотакамерай.

Бяспека дзяўчыны на вуліцы ў вячэрні час — не прыдуманая гісторыя. І перад намі — па-майстэрску выкананыя фатаграфіі. Лічу, гэта нават новы жанр апавядання — фотааповед, дзе мінімум тэксту і максімум драматызму. Аўтар разам са сваёй гераіняй рухаецца па цёмнай вуліцы дахаты.

У дыпломе прадстаўлена дзевяць планшэтаў-рэкамендацый, як сябе паводзіць, тых плакатаў, якія можна выдаваць масавым тыражом. Актуальнасць тэмы, дасканалае даследаванне праблемы начнога горада, высокамастацкае выкананне заслугоўваюць высокай адзнакі.

Настасся, або Там, дзе цесна, але ўтульна

Аўтар праекта "Людзі, якія працуюць у маленькіх прасторах" Настасся Бачыла правяла глыбокае сацыялагічнае даследаванне. Прызнаюся, спачатку быў не на баку аўтара. Але пераканаўчасць абароны падштурхнула мяне да прызнання сваёй некампетэнтнасці ў дадзеным пытанні.

Што бачым? Шэсць здымкаў, выкананых у розных месцах Мінска, там, дзе цесна, але ўтульна. Мо я не ўбачыў праблему, якую трэба вырашаць? Але — пабачыў вострае жаданне аўтара дапамагчы адзінокім людзям. І заключныя словы дыплома з'яўляюцца пацвярджэннем: "Складана казаць аб эфекце, які дадзены праект можа зрабіць. Дапускаю, ён можа быць карысным для ўсіх, хто даследуе і фіксуе візуальную культуру нашага часу".

Я ж распавяду, як на маіх вачах фотааматар стаў прафесіяналам-фатографам. Было гэта ў часы "перабудовы". Лёс, або выпадак, кінуў нас у камандзіроўку ў Заходні Берлін. Прыняў нас на высокім узроўні бургамістр. Мы жылі ў шыкоўным гатэлі ў цэнтры Заходняга Берліна. Сустракаліся раніцай за сняданкам.

"Мала часу застаецца", — наракаў неаднойчы Міхаіл. — "У чым справа?" — "Дык трэба ж над кожным негатывам папрацаваць!" (Здымалі мы на плёнку аналагавымі камерамі. — **Ю.І.**). Да майго глыбокага шкадавання, многія фотааматары асноўную частку часу праводзілі не на здымцы, дзе жыццё віруе, а ў лабараторыі, даводзячы малюнак да ідэальнай, як ім здавалася, якасці.

— Міша, — казаў я яму, — паглядзі: вакол нас — жыццё. Усё — новае, раней нябачанае. Сачы, заўважай, адкрывай яго для сябе. Спрачайся сам з сабой, са мной, з людзьмі навокал!

Вынікам камандзіроўкі была выстаўка "Іншымі вачыма". Фотаздымкі Міхаіла Жылінскага былі сапраўды адкрыццём Заходняга Берліна. У яго было жаданне "ўбачыць". І ён — убачыў!..

Дыпломная ж праца Настассі Бачыла заслугоўвае станоўчай ацэнкі.

Ірына, або Кветкі з намі...

Дыпломная праца Ірыны Залознай дзеліцца на дзве часткі. Першая, я назваў бы яе даследаваннем, разумее мову кветак і чалавека, які размаўляе на гэтай мове. Флораграфіка нарадзілася на Усходзе і знайшла працяг у нас. "Кветкі заўсёды скаралі чалавечае сэрца. Кветкі з намі — у дні радасці і ў дні смутку, яны дапамагаюць выказаць нашы пачуцці і настроі, яны натхнялі і натхняюць на стварэнне цудоўных вершаў і карцін", — піша Ірына і пацвярджае свае словы здымкамі ў календары — галоўнай частцы дыплома.

Фотаздымкі-кветкі ўяўляюць з сябе галерэю "Поры года". Мне прымроілася нават, што чую мелодыю Чайкоўскага. Чорны фон удала падкрэслівае прыгажосць кветкі. Мастак паказвае нам не ўсю яе, а толькі фрагмент, адзначаючы пункцірам сваю прысутнасць. Замест назваў месяцаў — лічбы. Карацей, мне спадабалася. У гэтым я ўбачыў філасофію.

Ведаеце, у Кодэксе гонару дызайнера ёсць такія словы: "Дызайнер абавязуецца з прафесійнай адказнасцю дзейнічаць у інтарэсах экалогіі і абароны асяроддзя". Ірына Залозная выдатна справілася з гэтым пунктам у Кодэксе гонару і яе дыпломная праца заслугоўвае высокага бала.

Наталля, або Верлібр прафесіі

Я такі каляндар купіў бы і павесіў на бачным месцы, распавядаючы сваім гасцям аб кожнай працы, адгортваючы лісты на месяц наперад! Выкананыя з любоўю да твораў калег з кафедры ДПМ, фатаграфіі становяцца вечнымі... Удала выкарыстаны святло, падабраны фон і колеравае рашэнне.

М.Зверава. З серыі выяў у тэхніцы пінхол.

У календары — шэсць лістоў: — па два месяцы на кожным. Гэта зачароўвае і стварае ўражанне інтрыгі. Асабліва на трэцім аркушы, калі вясна сустракаецца з летам. З задавальненнем гартаю:

Іней студзеня — лютага. Сакавік — красавік — чаканне цяпла і любові. Квітнеючыя май — чэрвень. Філасофская недаказанасць — ліпень — жнівень. З тонкім гумарам — верасень — кастрычнік. Халодныя лістапад — снежань.

Я назваў бы гэта паэмай, прысвечанай атмасферы творчасці і вопыту.

Асабліва адзначаю вокладку: фрагменты фатаграфій інтрыгуюць і прымушаюць чакаць адкрыцця.

"Рэклама — сацыяльны візуальны інструмент, які спрыяе прыцягненню ўвагі аўдыторыі да таго або іншага аб'екта", — піша ў сваёй дыпломнай працы Наталля Кашэўская. Падаецца, дакладнае вызначэнне.

Мая ж парада — высока трымаць гонар і годнасць сваёй прафесіі. Дыплом жа заслугоўвае высокай адзнакі.

І.Залозная. З календара ў жанры флораграфікі.

Вольга, або Той, хто мае рацыю

Атрымаў сапраўднае задавальненне, разглядаючы партрэты, выкананыя Вольгай Страх. Яна вельмі дакладна вызначыла падыход да працы фатографа (фотакарэспандэнта, фотамастака, рэпарцёра): "Для фатографа псіхалагічны партрэт — досыць складаная задача. Большасць людзей, пазіруючы, адчуваюць дыскамфорт. Заслужыць прыязнасць, дапамагчы ім расслабіцца і раскрыць свае характэрныя рысы не так проста".

Вольга, вы маеце рацыю. Адзін мой знаёмы кінааператар казаў: "Ты здымаеш адзін кадр, а ў мяне кіно — 24 кадры ў секунду! Я з гэтых метраў кінаплёнкі столькі шэдэўраў настрыгу!..".

Думаю, не са злосці мой калега сказаў такія словы. Я ж яму не адказаў тады. А ў нашай прафесіі галоўнае — злавіць момант, а раней — стварыць сітуацыю: у адрозненне ад кіно, фотакар — і аўтар сцэнарыя, і рэжысёр, і аператар, і мастак па святле...

Я не знаёмы з Вольгай, але ўбачыў у кожным партрэце яе саму, таму што яна не проста фатограф, а псіхолаг. Я заўсёды кажу: добрая фатаграфія — добрае стаўленне да фатографа. Перш чым сфатаграфаваць, яна (я ў тым пераканаў) выдаткавала не адну гадзіну на знаёмства з героем. Гэта стыль Карцье-Брэсона, які гадзінамі, ведаю, праводзіў са сваім сябрам і рабіў два — тры кадры. Іх мы вывучаем як класіку фотапартрэта.

Не верце тым, хто скажа: маўляў, сфатаграфаваць чалавека — абы-якая штука. Слушна, лічу, пра нашу прафесію сказаў мой калега Яўген Рагін: "Фатограф — паляўнічы за думкай. Ён гатовы сядзець у засадзе гадзінамі, вымотваючы ахвяру дашчэнту. Ахвяра, разумеючы непазбежнасць, пачынае здзіўляць: спачуваннем, поглядам, думкай".

Такім чынам, сем партрэтаў мастакоў. Георгій Паплаўскі. На мяне ён такім поглядам ніколі не паглядзіць, хоць знаёмы мы з ім шмат гадоў. Бачу тут характар мастака. Міхаіл Будавей: выдатны партрэт чалавека, занятага сваімі думкамі, і, у той самы час, адчуваю зноў-такі характар творцы. Алесь Ксяндзоў сваім поглядам ілюструе свае работы — такія ж задуменныя. Уладзімір Кожух: гэта не фотапартрэт, а — скульптура. Уладзімір Вішнеўскі ў сваёй задуменнасці перасягнуў у нечым, здаецца, самога Радэнавага "Мысляра". З Леанідам Хобатавым я не знаёмы, але, гледзячы на ягоны партрэт, убачыў яго падобным да Андрэя Рублёва, калі той увайшоў у храм з белымі сценамі, якія яму трэба было распісаць. А пра Уладзіміра Пракапцова ходзяць легенды. То ён кажана ператварыў у жанчыну, то, як у Шагала, ягоныя героі ўзляцелі. У мяне на выстаўцы ёсць яго партрэт на фоне Радзівілаўскай калекцыі. Але партрэт аўтарства Вольгі падкупіў мяне сваёй шчырасцю. Ён лепшы за маю работу.

Фотаздымкі выкананы ў чорна-белым варыянце, і ад гэтага яны выйграюць. Дыпломная заслугоўвае высокага бала.

Рэцэнзент Юрый ІВАНОЎ
Фота Юліі САВІЦКАЙ

Знаёмству з Арцёмам ЛОБАЧАМ "К" абавязана запрашэнню на прэм'еру яго фільма. Сярод дзясяткаў лістоў, што інфармуюць выданне, гэты "мэйл" аб закрытым паказе кароткаметражнай стужкі маладога аўтара зацікавіў рэччу амаль метафізічнай. Сёлета "Культура" апублікавала сінопсіс мастацкага фільма "Паціна", распавядаючы ў ім пра маладога рэжысёра, які адкрыў для сябе сваю краіну, яе культуру праз пошукі натхнення для стварэння ўласнага кіно ў спадчыне нашай зямлі. І — калі ласка! — маем запрашэнне на цалкам рэальную прэм'еру фільма (няхай і ў кароткім метры) за аўтарствам маладога чалавека, які амаль самастойна зняў карціну і ў якой узнімае пытанні той самай самаідэнтыфікацыі праз сродкі кіно. Іншымі словамі, усё гэта нагадвала сустрэчу з персанажам нашага сцэнарыя…

На здымачнай пляцоўцы ў Жалудку.

"Дом", які пабудаваў Арцём

Флюіды "Паціны" выпраменьвае час

Як і галоўны герой "Паціны", Арцём аказаўся студэнтам Акадэміі мастацтваў. Ён вучыцца на трэцім курсе па спецыяльнасці "рэжысура кіно і тэлебачання". Але, вядома, так не бывае, каб супадала ўсё: Арцём мае яшчэ і адукацыю дызайнера, якую атрымаў у Мастацкім вучылішчы імя Глебава, ды яшчэ памкненні працягваць навучацца прафесіі за мяжой. "Дом" — яго першая сур'ёзная праца ў іграваым кіно, як ён лічыць. Але і да гэтай пары ў маладога творцы быў пэўны вопыт ў стварэнні кліпаў і дакументалак. Нельга сказаць, што ў выніку ўсё, што было прапісана пра нашага героя Алеся ў форме сінопсіса журналістамі "К", дакладна ўвасобілася ў маладым чалавеку, але праводзіць паралелі, паверце, аказалася справай захапляльнай. І важна, што мы не памыліліся ў галоўным: у творчым і жыццёвым пошуку, які здзяйсняе Арцём. Яго кароткаметражка — гэта спроба знайсці сябе ў свеце, зразумець, якую культуру, светапогляд нясеш як творца, ды, урэшце, кім з'яўляешся на сваёй зямлі. Касмапалітам? Беларусам? Тое, што дадзеная тэма не давала і не дае спакою маладому пакаленню, мае доказы ў асобе Арцёма Лобача: у сваім прадчуванні нараджэння новага героя, выпісанага ў "Паціне", мы сапраўды "патрапілі".

Пра нараджэнне "Дома"

— Па першай адукацыі я — дызайнер. І дзякуючы назапашанаму досведу трапіў у памочнікі да Артура Клінава пад час ягонай працы на "Масакры" Андрэя Кудзіненкі. Кінематографам цікаўлюся даўно, але стварыць самастойнае кіно, нават кароткі метр, ніяк не наважваўся. Прычынай таму — сумневы рознага кшталту, але ў першую чаргу — творчыя: што менавіта я хачу сказаць. Калі ж, працуючы на "Масакры", пражыў у Жалудку амаль паўгода і ўбачыў працэс стварэння кіно знутры, зразумеў: надышоў мой час. І тады распачаў працу над сцэнарыем!

Што было далей — апісаць нялёгка. Я трапіў у палон эмоцый: мроілася, калі не здыму гэты фільм, не будзе жыцця. І ўсё панеслася адно за адным: сцэнарый, кастынг, здымкі… Цяпер ужо разумею: многія рэчы былі не прапрацаваны, я рабіў іх не так, як належыць, але мяне несла эмацыйная хваля. Нават акцёраў выбіраў, абапіраючыся, у першую чаргу, на іх чалавечыя здольнасці, а не на прафесійныя. Галоўным было, каб яны падыходзілі да маіх персанажаў…

Тым не менш, інтуітыўны падыход прынёс свой плён. Склалася каманда аднадумцаў, якая падтрымлівала і давярала мне, з ёй было цікава працаваць.

Арцём Лобач перад пачаткам здымак "Дома".

Пра эмоцыі і прафесіяналаў

— Шчыра кажучы, нават на пляцоўцы я не бачыў сваё кіно ў цэлым. І праблемы ўзнікалі: з акцёрамі, з рытмам працы… Але ўсе паставіліся да маіх спроб з цярпеннем, дапамаглі. Тыя ж Сяргей Каласоўскі, Інакенцій Січкар, прафесіяналы, якія працавалі на карціне, вельмі падтрымлівалі. Адказваючы на іх дакладныя пытанні, я пачаў уцямна бачыць і фармуляваць свае мэты.

А сёння ўжо бачу ўласныя хібы. Трэба было больш папрацаваць над сцэнарыем і канкрэтызаваць жанр, больш дакладна выбіраць акцёраў, хоць амаль ні на чый конт не памыліўся… "Вынасіць" бы ідэю, але чакаць не мог. І, прызнацца, не шкадую, што мы паехалі ў Жалудок ды знялі ўсё гэта. Тыя дзесяць дзён, якія правялі там, пацягнуць на асобны раман. І, падаецца, эмоцыі з пляцоўкі ўдалося данесці да гледача.

Пра Беларусь

— Галоўны герой маёй карціны збіраецца назаўжды пакінуць Беларусь. Але ён — у пэўным роздуме… Дзе ягоны дом? Што яго чакае? Я хацеў паразважаць на дадзеную тэму, бо ўсё гэта мне вельмі блізка: сёння я, як і ён, знаходжуся на раздарожжы. Планую таксама ехаць вучыцца за мяжу і мушу ў сабе разабрацца: навошта еду, калі вярнуся? І фінал у стужцы мае такі ж палярны адказ: герой з'язджае, але ён з'язджае, застаўшыся тут, зразумеўшы, адкуль ён. Ён прызнае сваім домам тую зямлю, дзе нарадзіўся...

Я сам родам з вёскі Селітрынка, што пад Барысавам. І заўжды, калі прыязджаю туды, адчуваю: гэта мой дом. З усімі байкамі, гісторыямі, містыкай, якія яшчэ жывуць навокал, з усім тым, што я перажыў там у дзяцінстве. Я ўсведамляю, мой шлях вядзе мяне далей — спасцігаць свет і прафесію, але што ні адбылося б, ведаю: гэтая зямля ў мяне ёсць.

Мой герой называе сябе касмапалітам. І я часта чую ад сваіх сяброў: маўляў, твой дом там, дзе твая галава. Гэта пазіцыя зразумелая, і я не збіраюся з ёю спрачацца. Можна вучыцца і працаваць дзе заўгодна, вандраваць, адкрываць іншыя культуры… Гэта ўсё добра, але, лічу, кожны чалавек мусіць заставацца носьбітам сваёй культуры. Не адмаўляцца ад той зямлі, што цябе выхавала! Я не падзяляю пазіцыю аднаго з герояў п'есы Максіма Горкага "На дне", які казаў: "Мой дом там, дзе цёпла".

Сёння многія людзі страцілі гэткі кантакт са сваім месцам. Лічу, падобным чынам адбываецца так, паколькі ў панэльным доме вялікага мегаполіса цяжка трымацца за тое, што дорыць энергію. Калі ж ты ўсё дзяцінства прабегаў басанож па зямлі — гэтая повязь будзе заўжды трымаць цябе.

Дарэчы, першапачаткова я планаваў, што дзеянне карціны будзе адбывацца на закінутым хутары… Але потым усё ж спыніўся на сядзібе ў Жалудку, каб падкрэсліць значнасць і ўрачыстасць дома.

Пра самастойнасць

— Спачатку я здымаў кіно на ўласныя грошы. Мне ўдалося зарабіць, і я вырашыў укласці сродкі ў гэты праект. Чаму вырашыў аддаць свае кроўныя? Я не хацеў ні ад каго залежыць. Бо гэта была сапраўдная рызыка, і мне не хацелася кагосьці падстаўляць. Тых грошай, што ў мяне былі, у выніку хапіла толькі на палову фільма. Аднак да таго часу, калі яны скончыліся, у мяне ўжо быў пэўны матэрыял і — самае галоўнае — упэўненасць: штосьці з адзнятага атрымаецца. Таму далей я не пабаяўся шукаць спонсараў. Так і здолеў завяршыць кіно.

Нягледзячы на заўвагі і недасканаласці, якія цяпер бачу і якія, па магчымасці, буду выпраўляць, я задаволены вынікам. Мне здаецца, тую эмоцыю, што кіравала мной, усё ж атрымалася данесці да гледачоў. Бачу, як людзі адгукаюцца, а значыць, мне трэба ісці далей і працаваць.

Аб прафесіі

— Пасля пэўнай дапрацоўкі мне хацелася б зрабіць адкрытую прэм'еру "Дома". Паказаць стужку ў Гродне, бо там яе чакаюць, магчыма, заявіць яе на фестывалях. Сёння я зноў думаю: якое яно — бачанне майго кінапасылу? Але я хацеў бы і далей ісці "ўглыб" чалавека, даследаваць яго прыроду, ягоную душу. Многія рэжысёры праводзілі тэму духоўнасці — Таркоўскі, Антаніёні, — і, як бы пафасна гэта ні гучала, я хачу быць іх паслядоўнікам, але — разглядаць дадзеную тэму праз прызму беларускай культуры. Мая мэта — паказаць, што ў чалавека ёсць вялікія магчымасці спазнання свету. І кінематограф, на маю думку, — менавіта той сродак, што, як аніякі іншы, здольны на гэтае даследаванне.

Занатавала Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

***P.S.** "Дом", які пабудаваў Арцём, — хутчэй, "кінаэсэ" , выкананае ў лірычна-містычных тонах, ды не пазбаўленае асабістай споведзі аўтара. Споведзі, якая, нягледзячы на пэўны недахоп почырку майстра, знаходзіць водгук у сэрцах беларусаў. І — падкупляе.*

Погляд кінакрытыка

Нараджэнне рэжысёра

Прафесіяналамі не нараджаюцца — імі становяцца. Але кароткаметражны "Дом", здаецца, даказвае адваротнае.

Арцём Лобач стаў рэжысёрам вось так, адразу, пасля здымак сваёй першай іграваой кароткаметражкі. Нягледзячы на свой малады ўзрост і ўзрост усіх членаў яго здымачнай каманды, Лобач зняў яркае і вобразнае відовішча з глыбокім унутраным сэнсам. "Дом" — аўтарскае прысвячэнне свайму роднаму краю, сваёй краіне, яе гісторыі і караням. Прыгожая, містычная драма пра Радзіму, з якой немагчыма развітацца, выканана ў свежым і яркім сучасным стылі. А галоўнае, "Дом", як і зняты ў тым палацы ў мястэчку Жалудок трылер Андрэя Кудзіненкі "Масакра", — гэта наша, нацыянальнае, зразумелае толькі нам, беларусам, як той верш Уладзіміра Караткевіча, які чытае напрыканцы стужкі галоўны герой "Дома" Алесь.

Малады герой карціны Арцёма Лобача стаў непасрэдным працягам вобраза патрыёта з раманаў Караткевіча, стужак Турава і Рубінчыка. У позірку выканаўцы ролі Алеся Мікалая Зіміча — шчымлівая туга Міцкевіча, Купалы, Быкава... Такі культурны падмурак робіць гонар маладым кінамастакам, што, спадзяюся, раз і назаўсёды прыйшлі ў прафесію. Як тое часта і адбываецца, Арцём Лобач прыйшоў у кіно з сумежнай прафесіі, і гэта вельмі добра адбілася на мастацкім складніку "Дома". Знятая "за пяць капеек" на сучасны лічбавы фотаапарат, а не на дарагую кінакамеру, стужка Лобача, тым не менш, глядзіцца куды цікавей за іншыя, "высокабюджэтныя", дзякуючы майстэрскай працы аператара Ягора Яфімава, мантажора Сяргея Каласоўскага ды іншых, крэатыўных і энергічных.

Кожная сцэна кароткай, 19-хвіліннай стужкі добра прапрацавана, а, галоўнае — добра прадумана. Пэўныя хібы сцэнарыя, штучнасць дыялогаў выбачаеш аўтарам не ў сілу іх узросту, а таго, што "Дом" — цэласнае, напоўненае вобразамі і пачуццямі відовішча. Уменне мысліць вобразамі — галоўнае для рэжысёра, і Арцём Лобач ім яўна валодае. А разам з тым уменнем збіраць таленавітую каманду і даводзіць свету, што будучыня нацыянальнага кіно на Беларусі — ёсць, бо ёсць маладыя таленты, якія яго, спадзяёмся, забяспечаць.

Антон СІДАРЭНКА

Новы этап развіцця сяла: самадастатковасць аддзела культуры

Два гады таму "К" востра ставіла перад аддзелам культуры Калінкавіцкага райвыканкама пытанне аб хоць і невялікім, але недавыкананні плана па аказанні платных паслуг, аб пэўным недахопе творчых ініцыятыў ва ўнікальным па культурна-гістарычнай брэндавасці краі. Нядаўняя камандзіроўка на радзіму аўцюкоўцаў і месца самай старадаўняй стаянкі першабытнага чалавека на тэрыторыі Беларусі засведчыла: усё цячэ і змяняецца не толькі ў адпаведнасці з законам дыялектычнага развіцця, а на дынаміку самарэалізацыі аддзела культуры ўплывае не руцінны самацёк, а дакладнае веданне галіновай перспектывы.

Яўген РАГІН:

— Змены ў раёне — відавочныя. Пачнём з будаўніча-рэстаўрацыйных работ. Тут, падаецца, Юравічы лідзіруюць: растуць музейныя сцены на месцы першабытнай стаянкі, ужо зззяюць золатам купалы колішняга езуіцкага калегіума...

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Юравічы для раёна — яркі турыстычны брэнд. Ці ж можна бяздзейнічаць з добраўпарадкаваннем вёскі, з якой кожны беларус знаёміцца на ўроках гісторыі яшчэ ў пятым класе? Першабытнай стаянкай цікавяцца і расіяне, і ўкраінцы, а таксама французы, італьянцы... А будынак калегіума — адзін з найстарадаўніх на Палессі. Пра ікону Божай Юравіцкай Маці таксама шмат каму вядома...

Яўген РАГІН:

— Але пэўнай інфраструктуры для турыстычнага "паломніцтва" і ў Юравічах, і ў раёне яўна не хапае...

Віктар ЗАМОСЦІК:

— І мы гэта цудоўна разумеем. На раённым узроўні прынята рашэнне ўзвесці не толькі музей на месцы стаянкі, але і летнюю кавярню паблізу.

Яўген РАГІН:

— Наколькі ведаю, адна са стабільных крыніц фінансавання юравіцкіх пераўтварэнняў — раённы бюджэт?

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Так, але найперш дапамагае, канешне ж, вобласць. У Юравічах задзейнічана мноства субпадрадчыкаў, бо работы збольшага — унікальныя: абшыўкай і пад'ёмам купалаў займалася мінская фірма, на музеі працуюць мясцовыя будаўнікі. Сродкі асвойваюцца інтэнсіўна. Патрэбна яшчэ больш за мільярд рублёў. Музей мяркуем здаць у наступным годзе. Для адраджэння ж калегіума сума будзе скарыстана значна большая.

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Хачу дадаць, што Юравічы — аграгарадок, добраўпарадкаванне тут праведзена ўзорнае, вуліцы і ўстановы, у тым ліку і клубная, выглядаюць не горш, чым у раённым цэнтры.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— А мясцовы школьны краязнаўчы музей па насычанасці экспанатамі не саступае нават раённым і абласным... Ёсць у Юравічах і невялічкая турбаза. Два гады таму "К" пісала пра нашага прыватнага бізнесмена Сяргея Гарбара, што наладжвае ў вёсцы аграэкатурызм.

Яўген РАГІН:

— Чалавек, гатовы ўкладаць грошы ў развіццё мясцовай інфраструктуры...

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Ды і з аддзелам культуры супрацоўнічае вельмі шчыльна цягам вось ужо чатырох гадоў... Многія нашы абрадавыя святы ладзім менавіта на ягонай прысядзібнай ды прыазёрнай тэрыторыі. Па сутнасці, ягоная аграэкасядзіба — адна са сцэнічных пляцовак Юравіцкага ДК, а шматлікія і пастаянныя турысты — спажыўцы мясцовай культуры, адны са сталых "пастаўшчыкоў" нашых пазабюджэтных сродкаў.

Яўген РАГІН:

— Ніхто з прыватнікаў культурна-арыентаваным прыкладам Сяргея Гарбара не натхніўся? Інакш кажучы, інвестары яшчэ ў чаргу не выстраіліся?

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Культура, нягледзячы на пэўныя спрыяльныя змены ў падаткаабкладанні прыватнага бізнесу, яшчэ не паспела стаць актыўнай дзялянкай для інвестарскіх намаганняў. Кожны з прадпрымальнікаў цяпер чакае неадкладнай грашовай аддачы ад укладзенага ў справу рубля. На перспектыўнае мысленне, я сказаў бы, у сучасных бізнесменаў пакуль часу не хапае. Тым не менш, пошук інвестараў вядзём пастаянна.

Яўген РАГІН:

— Пагаджуся, што і без інвестарскага падсілкавання аблічча Юравічаў апошнім часам змянілася надзвычай істотна. З 18 вашых аграгарадкоў гэтая вёска — адна з самых перспектыўных. Так што працэс "узбуяння" Юравічаў — непазбежны. Але мне найперш сімпатычны ўсё ж творчы складнік тутэйшай эвалюцыі. Мы два гады таму гутарылі з начальнікам аддзела культуры пра магчымасць вяртання старадаўняй мясцовай традыцыі наладжвання юравіцкіх кірмашоў, пра гандлёва-культурную веліч якіх у свой час яшчэ Іван Мележ пісаў у "Палескай хроніцы". І гэтая традыцыя, я даведаўся, пакрысе адраджаецца ў новым, так бы мовіць, "сцэнічным прачытанні".

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Адраджаецца, але пакуль — у раённым маштабе. Між тым, юравіцкія кірмашы збіралі ў свой час ці не ўсю Беларусь!

Яўген РАГІН:

— Пра рэбрэндынг і гаворка. Ніна Лешчанка, метадыст па фальклоры і мастацкі кіраўнік тэатра народнага гумару "Вясёлыя аўцюкоўцы", распавядала, з якой радасцю раённыя гледачы сустракаюць канцэртныя нумары на юравіцкіх гандлёвых плошчах і завулках.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Перспектыва тут — сапраўды вельмі прывабная. Не хачу раскрываць усе карты, але вось, да прыкладу, нямецкія інвестары выказалі інтарэс, каб Юравічы развіваліся не толькі ў турыстычным накірунку. Адна з нашых прапаноў — Юравічы творча-гандлёвыя.

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Напэўна, залішне казаць, што гэта дасць адчувальны штуршок развіццю народных промыслаў, рэалізацыі, у тым ліку, сувенірнай прадукцыі, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Натуральна, мы — за тое, каб будучы праект пасля рэалізацыі меў статус акцыі рэспубліканскай, нават міжнароднай. Лічыце, прыкідваем цяпер, якім будзе перспектыўны бізнес-план "Юравіцкага кірмашу".

Яўген РАГІН:

— Усё ж інвестары і спонсары ў Калінкавіцкім раёне ёсць, прынамсі, так званыя ўнутраныя. Яшчэ колькі гадоў таму пазнаёміўся са старшынёй СВК "Дружба. Аўцюкі" Сяргеем Даўгялам. Упершыню тады ўбачыў у Сыродзе аздобленыя маляўнічымі пейзажамі будынкі жывёлагадоўчых ферм і афармлены з густам парк "Для пацалункаў" пасярод вёскі...

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Сяргей Іванавіч не толькі культуру падтрымлівае. Упраўленне адукацыі аблвыканкама ўзнагародзіла яго ў намінацыі "За духоўнае адраджэнне і падтрымку школ". Выключна прагрэсіўны кіраўнік, што дбае не толькі пра вытворчасць, але і пра духоўнасць сваіх работнікаў.

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Даўгяла дапамагае не толькі асобных клубам, але і ўсёй раённай культуры. Узнагароды для пераможцаў раённага фестывалю "Запалі сваю зорку!" купляе менавіта ён. З гатоўнасцю выступае спонсарам і для іншых нашых мерапрыемстваў, не шкадуючы для іх двух — трох мільёнаў рублёў.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Дзякуючы Даўгялу новае аблічча займелі не толькі Сырод, але і Вялікія Аўцюкі. Там за спонсарскія грошы ўзведзены храм, пры якім дзейнічае бібліятэка царкоўнай літаратуры. Чытальная зала абсталявана сучаснай відэаапаратурай. І гэта таксама ініцыятыва старшыні СВК... Па сутнасці, з любым кіраўніком-аграрнікам знаходзім паразуменне ў справе сацыяльнай арыентаванасці іх дзейнасці. Але, натуральна, не кожны здольны на самастойныя праявы творчай ініцыятывы.

Яўген РАГІН:

— Менавіта такой ініцыятывы, стваральнай, нестандартнай, і не стае работнікам культуры?

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Скажам так: не ставала. Сітуацыя на сёння вельмі паказальная: на аддзелаўскія платныя карпаратыўныя канцэрты (кожны пад мільён каштуе) заявак ад арганізацый і прадпрыемстваў стала невымерна больш. Нават нашых шматлікіх самадзейных артыстаў для гэтага часам не стае. Даводзіцца адмаўляць — у першую чаргу тым, хто не надта імкнецца нам дапамагаць... Я — пра тое, што майстэрства калектываў і выка-

Юравіцкая стаянка

Народ пытаецца і прапануе

Крута! Арыгінальна! Мультымедыйна?

Фасад Калінкавіцкага цэнтра дасугу рамантуецца сіламі гаспадарчай групы і на пазабюджэтныя сродкі. План па аказанні платных паслуг сёлета выконваецца паспяхова, у тым ліку і за кошт маштабных канцэртаў. Пра гэта мне распавядалі многія жыхары горада і раёна.

Ірына, служачая з Калінкавічаў:

— Хачу выказаць удзячнасць аддзелу культуры за канцэрты зорак, у тым ліку і заезджых, што апошнім часам ладзяцца з зайздроснай стабільнасцю. Канцэрт Надзеі Бабкінай на гарадскім стадыёне — гэта крута! І білет за 20 тысяч рублёў — цалкам прымальна. А хутка адбудзецца выступленне "Ласкавага мая".

Старшакласнікі з вёскі Дудзічы:

— У нашым Цэнтры народнай творчасці не хапае мультымедыйнай устаноўкі. З ёй, па-першае, дыскатэкі будуць больш цікавымі. А па-другое, можна будзе ладзіць кіналекторыі па навучанні рамесніцкім тэхналогіям.

Будучы музей на месцы першабытнай стаянкі ў Юравічах.

Калінкавіччына: рэбрэндынг творчых праектаў

Вядуцца работы на колішнім Езуіцкім калегіуме.

Дамаўляліся на ўдзел у "лятучцы" старшыні Калінкавіцкага райвыканкама Івана Піліпца. Атрымалі зацікаўленую згоду. Але ў апошні момант старшыню выклікалі ў Гомельскі аблвыканкам. Што ж, справа ў журналісцкай практыцы звыклая. Не менш зацікаўлена аб праблемах і перспектывах мясцовай культуры гутарыў з намі намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях Віктар ЗАМОСЦІК. Натуральна, у "лятучцы" браў удзел начальнік аддзела культуры Віктар ЛЕВАНОВІЧ, які працуе на пасадзе чацвёрты год.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Дзякуючы Даўгялу новае аблічча займелі не толькі Сырод, але і Вялікія Аўцюкі. Там за спонсарскія грошы ўзведзены храм, пры якім дзейнічае бібліятэка царкоўнай літаратуры. Чытальная зала абсталявана сучаснай відэаапаратурай. І гэта таксама ініцыятыва старшыні СВК... Па сутнасці, з любым кіраўніком-аграрнікам знаходзім паразуменне ў справе сацыяльнай арыентаванасці іх дзейнасці. Але, натуральна, не кожны здольны на самастойныя праявы творчай ініцыятывы.

Яўген РАГІН:

— Менавіта такой ініцыятывы, стваральнай, нестандартнай, і не стае работнікам культуры?

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Скажам так: не ставала. Сітуацыя на сёння вельмі паказальная: на аддзелаўскія платныя карпаратыўныя канцэрты (кожны пад мільён каштуе) заявак ад арганізацый і прадпрыемстваў стала невымерна больш. Нават нашых шматлікіх самадзейных артыстаў для гэтага часам не стае. Даводзіцца адмаўляць — у першую чаргу тым, хто не надта імкнецца нам дапамагаць... Я — пра тое, што майстэрства калектываў і выканаўцаў павялічылася апошнім часам значна. Стала больш прафесіяналізму, а значыць — ініцыятывы... Вы два гады таму наведвалі Дудзічы, затрымаліся там, памятаю, на вельмі кароткі час. Пагаджаюся, тады мясцовыя культработнікі не надта маглі пахваліцца крэатывам. Гэтым разам дырэктар ЦНТ не адпусціла вас, пакуль не пазнаёміла з уласнымі праектамі, задуманымі і ўжо рэалізаванымі, пакуль не паказала кожны з пакояў, які аздоблены дзіцячымі творамі, як музей.

Яўген РАГІН:

— З гэтым нельга не пагадзіцца, як, дарэчы, і з тым, што масавая ініцыятыўнасць — мэта пакуль недасягальная.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Таму найпершай задачай нашага аддзела культуры лічу далейшае стварэнне моцных самадзейных ансамбляў. На сёння ў нас — 11 народных і ўзорных калектываў. Хтосьці скажа: колькасць — дастатковая, а я перакананы, што пры кожным нашым аграгарадку павінна існаваць брэндавае фарміраванне, і не проста існаваць, але творча канкурыраваць, абменьвацца канцэртамі. Вынікам такіх зносін абавязкова стане агульнае развіццё. А такая творчая эвалюцыя, я тут цалкам пагаджаюся з Віктарам Станіслававічам, цягне за сабой прафесіяналізм ды ініцыятыўнасць.

Яўген РАГІН:

— Ну, так павінна быць. А як ёсць насамрэч? Гаворка пра кадры непазбежна цягне за сабой аналіз адпаведных праблем…

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Самая набалелая звязана з недахопам харэографаў.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— А аналіз тут такі (і не толькі харэографаў маю на ўвазе): асобныя з работнікаў ва ўчарашнім дні засталіся...

Яўген РАГІН:

— Даруйце, перапыню: мне сямтам у раёнах расказваюць пра тое, што ў кіраўнікоў сельскіх клубных устаноў памеры заробкаў у параўнанні з іншымі вяскоўцамі, мякка кажучы, не маленькія...

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Магу пацвердзіць гэтыя словы. Зарплаты для вёскі — неблагія, але ж і аддача павінна быць адпаведнай...

ў кірмашовым бізнес-плане

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Я, па сутнасці, — пра тое ж. Адпаведнай аддача будзе тады, калі чалавек не толькі пра сённяшні, але і пра заўтрашні дзень дбае, як гэта ў Дудзічах робяць. Нельга ў нашай сферы дзейнічаць па ўказцы... А зараз — пра харэографаў. Спецыяліста "прыдбаць" — не праблема. Але гэта павінен быць менавіта прафесіянал, педагог, арганізатар. Мне падаецца, што сённяшнія выпускнікі харэаграфічнага аддзялення вучылішча танцуюць тэхнічна, бездакорна, але методыкай выкладання сваёй дысцыпліны валодаюць недастаткова. Я сам калісьці займаўся ў танцавальным калектыве, і памятаю, як з намі скрупулёзна працавалі выкладчыкі... Любы работнік культуры, урэшце, павінен рыхтаваць сабе годную замену.

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Не прыхоўваю, што іншым разам вельмі цяжка знайсці замену тым кіраўнікам клубных устаноў, што сыходзяць на пенсію. Прапаноў з прычыны добрага заробку — шмат, а выбіраць іншым разам няма з каго. Разумею, што ў тым — пэўная доля і маёй віны з-за недастаткова эфектыўнай прафарыентацыйнай працы. Але што рабіць у вёсках, дзе моладзі не засталося, а ў клубах патрэба не знікла? Зачыняць іх — папросту злачынна. Вось у Клінску сельскім клубам загадвае 68-гадовая Клаўдзія Міканораўна Шпак, мае свой вакальны калектыў, актыўна гастралюе з ім па сельсавеце. Па выніках гэтых гастролей у райгазеце заўжды мноства станоўчых водгукаў ад жыхароў ледзь не ўсіх сельсаветаўскіх вёсак. Кім можна такую кіраўніцу замяніць?

Яўген РАГІН:

— Адсутнасць раённага Цэнтра рамёстваў нейкім чынам звязана з недахопам адпаведных кадраў?

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Ды не. У Калінкавічах працуе славуты майстар кавальскай мініяцюры Міхаіл Яршоў. Шмат цудоўных рамеснікаў, як вы пераканаліся, у Дудзічах. Неаспрэчна, патрэбна пры кожнай сельскай клубнай установе адраджаць традыцыйныя рамёствы, адшукваць і заахвочваць майстроў.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Дом рамёстваў, неаспрэчна, патрэбны. І мы яго неўзабаве адкрыем, але мяне найперш цікавіць яго годнае насычэнне. Згодны з начальнікам аддзела культуры: неабходна актывізаваць адраджэнне нашага традыцыйнага мастацтва.

Яўген РАГІН:

— Моладзь просіць набыць для ЦНТ у Дудзічах мультымедыя-апаратуру…

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Мы таксама гэтага вельмі жадаем. Летась займелі мультымедыйку для раённых Цэнтра дасугу і бібліятэкі за дзесяць мільёнаў. Зрабіць гэта было зусім не проста. Як толькі з'явяцца грошы, набудзем тэхніку і для Дудзічаў: яна там сапраўды патрэбная.

Яўген РАГІН:

— Самы час пагутарыць пра пазабюджэт, які ў вас апошнім часам стабільна павялічваецца. За кошт канцэртаў заезджых расійскіх зорак?

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— У пэўнай ступені — так. Калі ёсць магчымасць наўпрост запрашаць Бабкіну і Разіна на выступленні па нашых білетах, дык чаму яе не выкарыстоўваць? Згодна з дагаворам, дваццаць працэнтаў з канцэртных збораў ідзе ў выкананне раённага плана па аказанні платных паслуг насельніцтву. Прычым гэта ніякім чынам не азначае, што сельскія ўстановы спадзяюцца толькі на патэнцыял раённага Цэнтра дасугу, але мы пра тое ўжо казалі.

Яўген РАГІН:

— Мы пра другі ваш брэнд — Рэспубліканскі фестываль гумару ў Аўцюках — пагутарыць не паспелі. Наколькі ён раскручаны? Бачыў у вашых крамах парцалянавы посуд, каляндарыкі з фестывальнымі лагатыпамі. Аўцюкоўскія дывідэнды атрымліваеце напоўніцу, ці ёсць рэзервы?

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Ёсць. Сувеніры робяцца на самых розных прадпрыемствах рэспублікі па нашым заказе. Але іх, як думаецца, недастаткова. Брэнд — ходкі, але яго трэба далей раскручваць, як, дарэчы, і сам фестываль. Нельга яго ладзіць з наскоку. Першыя два фэсты ў кожнага ў памяці засталіся, а наступныя — у пэўнай ступені сталіся таўталогіяй.

Віктар ЛЕВАНОВІЧ:

— Чарговы фестываль гумару мы запланавалі на наступны год, рыхтуемся да яго ўжо цяпер, і прыкладзём усе намаганні, каб быў ён адметным і запамінальным.

Віктар ЗАМОСЦІК:

— Паўтаруся яшчэ раз: аддзел культуры павінен штодня працаваць над якасцю мерапрыемстваў, павышаць узровень паслуг, не заставацца ва ўчарашнім дні і яскрава бачыць дзень заўтрашні.

Яўген РАГІН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Калінкавіцкі раён — Мінск
Фота аўтара

Намеснік старшыні Калінкавіцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Віктар Замосцік (злева) і начальнік аддзела культуры Віктар Левановіч.

Дэталь да агульнай карціны

"А эстрада будзе на выспачцы..."

На адной з аператыўных нарад кіраўніцтва Калінкавіцкага раёна вырашыла ўзяцца за добраўпарадкаванне вадаёмаў.

Таму ініцыятыва дырэктара Цэнтра народнай творчасці ў Дудзічах Наталлі Качура імгненна знайшла райвыканкамаўскую падтрымку. А ініцыятыва — наступная: ля ЦНТ ёсць невялічкі парк, сажалка, выспа на ёй. Наталля Качура збіраецца "акультурыць" не толькі азёрныя берагі, але і выспу, каб размясціць там летнюю эстраду, танцпляцоўку.

Ідэі ў Наталлі проста фантануюць. Прыклубная тэрыторыя пакрысе ўпрыгожваецца скульптурай. Пры ЦНТ ствараецца маленькі этнаграфічны музейчык. А для пашырэння кола паслуг дырэктар марыць прыдбаць колькі лодак ці катамараноў.

На здымку: дырэктар ЦНТ вёскі Дудзічы Наталля Качура мяркуе, што "на гэтай сажалцы не перашкодзілі б лодкі і катамараны!".

На людным месцы

Мядзельшчына: традыцыі майстроў

На ўсе рукі!

А замежнікі купляюць наша!

18 — 19 чэрвеня народныя майстры і рамеснікі з'ехаліся на Мядзельшчыну для ўдзелу ў VI Рэспубліканскай выстаўцы-кірмашы "Камарова — кола дзён". Калі на першым такім свяце іх было ўсяго 36, летась — ужо 180, дык сёлета — больш за 230.

Вітольд Малютка.

Адкрываючы ўрачыстасць, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Ярмак падкрэсліў: правядзенне такіх выставак дае магчымасць, да ўсяго, абмеркаванню праблем. Сапраўды, у той час, як на стадыёне сярод парку разгортваўся Горад майстроў, ішлі выступленні аматарскіх калектываў (асабліва ўразіў жаночы вакальны ансамбль "Натхненне" Мядзельскай ДМШ), прадстаўнікі абласных, раённых улад і спецыялісты па развіцці прадпрымальніцтва сабраліся на "круглы стол". А ўсё таму, што Камарова — вёска незвычайная. Непадалёк — Нарач і Блакітныя азёры.

Сярод гасцей, што наведалі выстаўку, было нямала замежнікаў — найперш тых, хто адпачывае ў нашых санаторыях. Сапраўды, чаму б не "адпачыць" ад працэдур на свяце? Тут можна і ганчарнае кола пакруціць, і з саломкі паспрабаваць вяночак сплесці, і за кросны сесці — асабліва калі за імі… мужчына.

— Ткацтва ад жонкі пераняў, — кажа Вітольд Малютка з Валожыншчыны. — Маці таксама была майстрыхай, але мяне ганяла, а вось жонка — дазваляе. Мы з ёй разам ужо 30 гадоў працуем: яна пачне — я прадоўжу ці наадварот. Да мяне і дзятва прыходзіць: вяду гурток пры Каменскім СК. Зноў-такі, яго наведваюць і хлопцы.

Няма адбою ад цікаўных і ў ганчара Сяргея Шчэрбы з Пастаўшчыны. А вось Наталля Хаванская з Сакавіцкага СДК прывезла плеценыя з нітак паясы з беларускім арнаментам і калекцыю лялек.

Чым жа цікавяцца пакупнікі?

— Нашы пакупнікі, — усміхаецца майстрыха, — часцей купляюць лялекваўскоўцаў ці міліцыянераў. А вось замежнікі бяруць, найперш, лялькі, апранутыя ў нацыянальнае адзенне. Дзеці, што ў мяне займаюцца, таксама і паясы выробляюць, і лялек майструюць. Ды мне і самой, бы таму дзіцяці, усё хочацца паспрабаваць: і з саломкі сплесці, і з нітак, і традыцыі нацыянальныя прадоўжыць, і самой штосьці прыдумаць.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота аўтара

Пінск: фольк у міжнародным кантэксце

Аўтэнтыка і "...Карункі"

У гарадскім парку Беластока адбылося традыцыйнае мерапрыемства "Свята беларускай культуры".

Яно было арганізавана Беларускім грамадска-культурным таварыствам і Таварыствам беларускай культуры ў Польшчы пры садзейнічанні Пасольства і Генеральнага консульства Беларусі ў Беластоку, фінансавай і творчай падтрымцы Міністэрства культуры нашай краіны. Удзельнікамі свята сталі 26 аматарскіх калектываў беларусаў Польшчы. А сапраўдным ўпрыгожаннем мерапрыемства сталася выступленне фальклорнай групы "Купалінка" Белдзяржфілармоніі, а таксама танцавальнага калектыву "Гарадзенскія карункі" Гродзенскага мастацкага каледжа.

Днямі ж, як паведамляе метадыст пінскага раённага метадцэнтра Вольга Казека, фальклорна-этнаграфічны калектыў "Ладаражаначка" з вёскі Ладараж Пінскага раёна прыняў удзел у X Еўрапейскім фестывалі фальклору "Прыбужскія сустрэчы", што ладзіўся ў іншым польскім горадзе — Сакалоў-Падляскі.

Удзельнікі "Ладаражаначкі".

На фестывалі аўтэнтычны фальклорны гурт прадэманстраваў тэатралізаваны абрад "Ваджэнне куста", які з'яўляецца асаблівасцю траецкага свята на Пінішчыне. Ансамбль увайшоў у чацвёрку лепшых калектываў і быў адзначаны спецыяльным дыпломам бурмістра ў намінацыі "Аўтэнтычнасць рэпертуару і яго арыгінальнасць", а таксама — каштоўнымі прызамі.

Бяспека жыцця

Асцярожна: вада!

Аксіёма: знаходзячыся ля вады неабходна прытрымлівацца пэўных правілаў.

Пры арганізацыі экскурсій і паходаў патрэбна сістэматычна праводзіць з іх удзельнікамі тлумачальную работу аб правілах паводзін на вадзе. Купанне варта ладзіць групамі да 10 чалавек у абгароджаных месцах з глыбінёю не больш за 1,5 метра і працягласцю да 20 хвілін. Дно месца купання павінна быць ачышчана ад пабочных прадметаў. За тымі, хто купаецца, неабходна бесперапынна назіраць, а таксама патрэбна мець спецсродкі: выратавальныя кругі з разліку адзін круг на пяць чалавек, шост, вяроўку і лодку, абсталяваную выратавальным кругам і вяроўкай.

Згодна з правіламі, забараняецца купацца ў неабсталяваных, незнаёмых месцах, заплываць за буйкі, падплываць да маторных, парусных, веславых лодак, скакаць у ваду з катараў, лодак, прычалаў, а таксама прыстасаванняў, не прызначаных для гэтых мэт. Нельга забруджваць вадаёмы або пакідаць на беразе смецце, распіваць спіртныя напоі, купацца ў стане алкагольнага ап'янення, а таксама дапускаць у вадзе гульні, звязаныя з ныраннем і захопам тых, хто купаецца. Нельга падаваць крыкі падманнай трывогі, плаваць на дошках, бярвеннях, тапчанах, аўтакамерах.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС г. Мінска

Ювелірных спраў майстар, вядомасць якога звязана з адной з самых скандальных у свеце мастацкіх падробак, нарадзіўся ў 1860 годзе на беларускім Палессі, у Мазыры. Ізраіль Рухамоўскі атрымаў рэлігійную адукацыю, але самастойна авалодаў ювелірным і гравюрным майстэрствам. Дваццацігадовым яго прынялі ў майстэрні Кіева, Адэсы.

Хата Рухамоўскіх у Мазыры.

Легенда пра тыяру

Палеская фальшыўка-шэдэўр для Луўра

Ізраіль Рухамоўскі.

Сярод заказчыкаў маладога ювеліра былі і ачакаўскія купцы — браты Гохманы, якія праз падстаўных асоб пастаўлялі найбуйнейшым музеям Еўропы падробкі прадметаў антычнай культуры. Калі інтарэс да скіфскіх старажытнасцей зменшыўся, Гохманы пачалі прадаваць музеям "антычныя" творы з золата, зробленыя "на месцы" — таленавітымі майстрамі ў Адэсе. А адзін з братоў рабіў эскізы "старажытнасцей", якія потым ператвараліся ў каралі, пярсцёнкі, дыядэмы, завушніцы і іншыя ўпрыгожанні.

У 1895 г. браты наважыліся на больш сур'ёзную аферу. Ювеліру Ізраілю Рухамоўскаму яны сказалі, што жадаюць падарыць аднаму прафесару з Харкава копію старажытнай тыяры — галаўнага ўбору, які падкрэсліваў высокае грамадскае або рэлігійнае становішча ўладальніка. Тыяра мае старажытнаперсідскае паходжанне, і Рухамоўскі, цалкам не знаёмы са спецыфікай замоўленага яму прадмета, засеў за кнігі па гісторыі сусветнай культуры. На атрыманы ад заказчыкаў аванс ён купіў у аднаго адэскага ювеліра залатую пласціну вагой 486 грамаў і пачаў працаваць. Праз 9 месяцаў тыяра была зроблена. Купалападобны парадны шлем упрыгожвалі некалькі гарызантальных арнаментальных паясоў. Адзін з іх увасабляў вобразы "Іліяды" і "Адысеі". Чаканка ніжняга пояса адлюстроўвала сцэны з жыцця скіфскіх качэўнікаў. Надпіс на старажытнагрэчаскай мове апавяшчаў, што тыяру цару Сайтаферну паднеслі жыхары Ольвіі. Харастро тыяры, багацце ўбораў, тонкасць малюнкаў былі настолькі дасканалыя, што заказчыкі вырашылі рызыкнуць і адвезці твор знаёмага ювеліра ў Венскі імператарскі музей, пазначыўшы яго як "тыяра скіфскага цара". Пры гэтым "антычны" прадмет быў забяспечаны легендай, ці дакладней — дакументамі, што сведчылі пра знаходжанне дадзенага артэфакта пад час раскопак у раёне Ольвіі, якая ў глыбокай старажытнасці з'яўлялася найбуйнейшай грэчаскай калоніяй у вусці Буга і Дняпра.

Як ні дзіўна, запрошаныя для экспертызы найбуйнейшыя венскія археолагі і мастацтвазнаўцы пацвердзілі сапраўднасць тыяры, заявіўшы, што яна і праўда належыла скіфскаму цару Сайтаферну і датуецца II стагоддзем да нашай эры. І калі ў Венскага імператарскага музея на той час не знайшлося сродкаў на набыццё гэтага шэдэўра, то яны знайшліся ў Луўры, эксперты якога таксама пацвердзілі арыгінальнасць прадмета. Пры фінансавай падтрымцы мецэнатаў у сакавіку 1895 г. тыяра ўжо належыла французскаму музею. На пачатку красавіка найбуйнейшыя навуковыя дзеячы Парыжа зрабілі гучную аб'яву ў прэсе і ахарактарызавалі прадмет як "само Мастацтва ў сваім найбольш тонкім і чыстым выглядзе". У выніку фальшывы экспанат заняў пачэснае месца ў пастаяннай экспазіцыі Луўра, захапляючы ўсіх сваім хараством. Больш за тое: французскі парламент заднім чыслом зацвердзіў асігнаванні на закупку "шэдэўра антычнага свету". Такім чынам Гохман атрымаў 86 тысяч франкаў, а два яго пасрэднікі — 40 і 74 тысячы франкаў адпаведна.

Так выглядала тыяра, увага спецыялістаў да якой была надзвычайнай.

Аднак не ўсе спецыялісты былі ўпэўнены ў сапраўднасці экспаната. Існавалі меркаванні, што ў шэрагу персанажаў, выяўленых на тыяры, ёсць рэальныя прататыпы на прадметах розных эпох і рэгіёнаў. У прэсе пачалі з'яўляцца публікацыі пра выпадкі фальсіфікацыі прадметаў даўніны з удзелам братоў Гохманаў. Але з "тыярай скіфскага цара" гэтыя выпадкі ніхто не звязаў. Хутчэй за ўсё, афера так і засталася б нявыкрытай, калі б парыжскі ювелір Элін Маенс не заявіў у пачатку 1903 г., што тыяру зрабіў ён. Узняўся грандыёзны скандал. Але яшчэ большы скандал адбыўся тады, калі ў абарону сапраўднага аўтара тыяры выступіў яго сябра, адэскі ювелір Ліўшыц, які апісаў, як гэты прадмет ствараўся на яго вачах. Рухамоўскага пачаў даймаць натоўп журналістаў, і той пацвердзіў справядлівасць слоў свайго сябра.

Але ніхто ў свеце не паверыў гэтаму: нікому не змагло прыйсці ў галаву, што нейкі сціплы ювелір, ураджэнец Мазыра, змог стварыць такі шэдэўр. І тады Рухамоўскі заявіў, што гатовы паехаць у Парыж і даказаць сваё аўтарства. Ён паставіў адну ўмову: хтосьці павінен заплаціць за паездку. Патрэбны былі 1200 франкаў. Грошы неўзабаве знайшліся, і наш зямляк апынуўся ў сталіцы Францыі.

Фальшывая каштоўнасць да таго часу была адпраўлена ў запаснікі Луўра — як мага далей ад журналістаў і натоўпу ахвотных паглядзець на прадмет скандалу. У сваю чаргу, абражаны ўрад, які выплаціў велізарныя грошы за набыццё "шэдэўра", стварыў аўтарытэтную камісію па расследаванні інцыдэнту.

Работы, прадстаўленыя Рухамоўскім у якасці сведчання свайго майстэрства, у тым ліку стылізацыі пад антычнасць — рог для піцця (рытон), скульптуры Афіны і Ахілеса з золата, нават дэманстрацыя гравюр з атласа "Старажытнай гісторыі" Вейсера, з якіх ён "здымаў" упрыгожанні шчыта Сцыпіёна і фрэскі Рафаэля, — не пераканалі прысутных спецыялістаў. І тады Рухамоўскі літаральна на вачах недаверлівых французскіх мастацтвазнаўцаў зрабіў частку фігурнага фрызу, абсалютна ідэнтычнага таму, што быў на тыяры. І толькі тады выдатнаму ювеліру паверылі. Больш за тое: 26 мая 1903 г. яго ўзнагародзілі медалём французскай секцыі дэкаратыўнага мастацтва III ступені.

Усё астатняе жыццё Ізраіль Рухамоўскі правёў з жонкай і дзецьмі ў Парыжы, выконваючы заказы багатых французаў, сярод якіх быў і барон Ротшыльд. Там ён памёр і быў пахаваны ў 1936-м. Не дзіўна, што і яго дзеці сталі вядомымі ювелірамі, мастакамі і літаратарамі.

А са скандальнай тыярай скіфскага цара можна і сёння пазнаёміцца ў Музеі дэкаратыўнага мастацтва ў Парыжы, куды яна была перададзена для экспазіцыі Луўрам.

Ганна БУЛАШ, бібліятэкар Мазыр

Фота з фондаў Мазырскага краязнаўчага музея.

Тыдзень эксклюзіваў

Цягам тыдня ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адбудзецца шэраг мерапрыемстваў, якія мусяць праліць святло на малавядомыя факты з айчыннай гісторыі мінулага стагоддзя, і ў першую чаргу — звязаныя з лёсам дзеяча нацыянальнага адраджэння Івана Луцкевіча.

Менавіта гэтаму славутаму чалавеку, збіральніку і даследчыку беларускіх старажытнасцей, 130-годдзе з дня нараджэння якога сёлета адзначаецца, будзе прысвечаны прадстаўнічы "круглы стол". У межах форуму разгледзяць пытанні першых спроб стварэння Беларускага музея ў Вільні, лёсу яго бібліятэкі, калекцый кніжных выданняў і фотаздымкаў, помнікаў сфрагістыкі.

Беларускі музей імя Івана Луцкевіча

З удзелам гісторыкаў, культуролагаў, мастацтвазнаўцаў, супрацоўнікаў музеяў, архіваў, бібліятэк плануецца абмеркаваць і пытанне па аднаўленні, хаця б у віртуальнай прасторы, унікальнай асветніцкай установы — Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея, які існаваў у 1921 — 1945 гг.

Не менш пазнаваўчай мае стаць і дакументальная выстаўка "Ротмістр Вітольд Пілецкі. 1901 — 1948", а таксама прэзентацыя аднайменнай кнігі польскага даследчыка Яцэка Паўловіча.

Як адзначылі ў Нацыянальным гістарычным музеі, Вітольд Пілецкі належаў да беларускага шляхецкага роду герба "Ляліва", а яго малой радзімай была Навагрудчына. За ўдзел дзеда Вітольда Пілецкага ў паўстанні 1863 г. царскія ўлады канфіскавалі амаль усе землі, якія належылі сям'і. У выніку Пілецкія былі вымушаны з'ехаць у Карэлію. Знакамітым жа ён стаў як змагар з фашызмам у гады Другой сусветнай вайны.

На здымках: Іван Луцкевіч; выява пячаткі музея.

З пошты "К"

Серыял і партрэты

"Тэатры-студыі" ля мікрафона і ў музеях

22 чэрвеня на Першым канале Беларускага радыё ў праграме "Кароткія гісторыі" распачаўся радыёсерыял "Шляхам Перамогі" паводле апавяданняў беларускіх пісьменнікаў: Васіля Быкава, Івана Навуменкі, Міхася Лынькова, Алеся Савіцкага, Уладзіміра Федасеенкі, Алеся Шашкова. Творы, прысвечаныя старонкам гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выконвае артыст, рэжысёр Беларускага радыё Алег Вінярскі.

У творчым багажы яго шмат работ, прысвечаных ваеннай тэме. Адна з апошніх — пастаноўка радыёспектакля "Пастка" паводле аднайменнай аповесці Васіля Быкава. Ва ўвасабленні яе прынялі ўдзел такія мэтры беларускай сцэны, як народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў, заслужаны артыст Беларусі Андрэй Душачкін ды многія іншыя творцы.

Вінярскі-рэжысёр здолеў літаральна за адну гадзіну перадаць атмасферу часоў Вялікай Айчыннай вайны: артысты не іграліі, а — жылі на прыфрантавой паласе, на мяжы згубы. Да таго ж, голасам Алега Вінярскага агучваліся антываенныя думкі герояў твораў не толькі Васіля Быкава, але і Кузьмы Чорнага, нямецкага пісьменніка-антыфашыста Віллі Брэдэля ды многіх іншых літаратараў.

Ля мікрафона Нацыянальнага радыё Алег Вінярскі працуе ўжо чвэрць стагоддзя. За гэты час ён правёў больш за тры тысячы мастацкіх праграм. Значны ўклад зроблены ім у літаратурныя музеі, якія сталі своеасаблівымі тэатрамі-студыямі, дзе адбываюцца камерныя спектаклі.

Шмат вялікага душэўнага запалу ў голасе спатрэбілася артысту, каб пражыць ля мікрафона, чытаючы цягам месяцаў унікальную эпапею "Прыгоды бравага салдата Швейка" Яраслава Гашака. Перад Вінярскім стаяла складаная задача персаніфікаваць кампазіцыйна мудрагелісты тэкст і стварыць драматычна "ясную" карціну, выклікаць у слухача адпаведную рэакцыю суперажывання.

З найбольш яркіх апошніх дасягненняў Алега Вінярскага можна вылучыць літаратурнае чытанне рамана Я.Брыля "Птушкі і гнезды", а таксама пастаноўку на Беларускім радыё спектакля па п'есе Уладзіслава Сыракомлі "Магнаты і сірата", прысвечанага постаці князёўны Сафіі Слуцкай.

Нельга не адзначыць і адметны творчы праект, створаны пры непасрэдным удзеле Алега Вінярскага. Пастаноўка "Паміж двух партрэтаў", прэм'ера якой адбылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, аб'яднала такіх знакамітых творцаў, як Мікалай Гогаль і Сяргей Ясенін.

Таццяна ІГНАТОВІЧ

На здымку: Алег Вінярскі чытае фрагменты з твораў Івана Шамякіна ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Альфрэд Ромер — яшчэ адна выдатная асоба, якая павінна па-сапраўднаму ўвайсці ў нацыянальную гісторыю выяўленчай культуры Беларусі нароўні з імёнамі такіх яе папярэднікаў і сучаснікаў, як І.Аляшкевіч, В.Ваньковіч, А.Шэмеш, Я.Дамель, Я.Сухадольскі, К.Альхімовіч, С.Заранка, М.Э. Андрыёлі, І.Хруцкі, А.Гараўскі, Н.Сільвановіч… Аднак на радзіме яго яшчэ мала ведаюць, і толькі дзякуючы некаторым айчынным даследчыкам (Л.Дробаў, А.Цыркуноў, Л.Карповіч) імя Альфрэда Ромера цалкам не канула ў вечнасць. Але для большасці беларусаў гэты таленавіты жывапісец, рысавальшчык, гравёр, скульптар і мастацтвазнаўца і сёння застаецца пакуль што мала вядомым.

А.Ромер. "Аўтапартрэт".

Фарбавае поле "Мадонны Пінскай"

Спружына экспрэсіі Альфрэда Ромера

Праўда, на Пастаўшчыне, дзе ён цэлых дзесяць гадоў, пачынаючы з 1874-га і да ад'езду ў Кракаў, жыў у маёнтку Каралінава Свянцянскага павета Віцебскай губерні (цяпер — тэрыторыя Камайскага сельскага савета Пастаўскага раёна), яго добра ведаюць: ёсць там і вуліца, якая носіць ягонае імя, і дзіцячая мастацкая школа, названая ў гонар творцы. У суседняй вёсцы Камаі на высокім пагорку захаваўся і касцёл абарончага тыпу Святога Іаана Хрысціцеля пачатку XVII ст., які распісваў мастак і ў якім знаходзіцца яго карціна "Хрыстос і сірата". Дарэчы, парафія Камайскага касцёла абвясціла 2007-ы Годам Альфрэда Ромера. А яшчэ, я памятаю, як, здаецца, вясной 2003-га ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце ўпершыню быў праведзены вечар

А.Ромер. "Сялянскі двор".

памяці Ромера, арганізаваны грамадскім аб'яднаннем "Гісторыка", Саюзам мастакоў Беларусі і студэнтамі архітэктурнага факультэта. У зале былі прадстаўлены фамільнае дрэва Ромераў, выява ромераўскага маёнтка ў Каралінаве і рэпрадукцыя апошняга твора мастака — "Хрыстос і страта". Але пасля ўсіх гэтых мерапрыемстваў імя Ромера зноў аказалася забытым. Між тым, налета, 16 красавіка, — 180 гадоў з дня нараджэння нашага зямляка, і хацелася б, каб ягонае імя зноў, і на поўную моц, прагучала ў нашай краіне. Надышоў час "збіраць камяні"…

Наогул кажучы, рыцарска-шляхецкі род Ромераў вядзе свой пачатак з XV ст., з Саксоніі. Потым яго прадстаўнікі праз Курляндыю перабраліся ў ВКЛ, дзе ў розныя часы займалі гуманітарныя і грамадскія пасады, якія дазволілі ім унесці значны ўклад у развіццё культуры Беларусі, Літвы і Польшчы. Але род гэты быў яшчэ ўнікальны ў тым сэнсе, што з канца XVIII ст. у гэтай дынастыі існавала некалькі пакаленняў мастакоў! Пачынальнікам яе быў бацька Альфрэда — Эдуард Ян Ромер (1796 — 1878 гг.) — вучань выдатнага прафесара жывапісу Віленскага ўніверсітэта Яна Рустэма, які цудоўна рысаваў, ствараў партрэты перадавых дзеячаў культуры Беларусі і Літвы, нават ілюстраваў ноты А.Манюшкі. Наогул кажучы, гэта была ўнікальная асоба. За ўдзел у паўстанні 1863-га адсядзеў некалькі месяцаў у турме. А ў 1868-м — зноў асуджаны і высланы на 13 гадоў у Волагду, а потым — у Вялікі Усцюг. З ім паехала жонка Соф'я Белазорава, маці малодшага брата Альфрэда — Эдуарда Матэя Ромера, таксама будучага мастака-жывапісца. Пасля заканчэння Віленскай гімназіі ён навучаўся ў Дрэздэнскай і Мюнхенскай акадэміях мастацтва. У 1870-я гады шмат вандраваў па Еўропе, а калі ў 1878 г. вярнуўся ў Вільню, дык адкрыў там мастацкую майстэрню і карыстаўся ёй сумесна з братам Альфрэдам і сябрам Францішкам Юргілевічам. Праз два гады ажаніўся з Юзэфай Чахоўскай і атрымаў у якасці пасагу маёнтак у Лунне на Гродзеншчыне. У гэтыя часы шмат пісаў бытавыя і гістарычныя карціны, у тым ліку прысвечаныя драматычным падзеям 1863 г., а таксама пейзажы і партрэты: "Завіруха", "Ля вакзала", "Ля майстэрні", "Патруль", "Хаціна ў лесе", "Адпачынак перад карчмой", "Амазонка", "Пасля работы", "Вяртанне", "Мая хата", "Тры каралі", партрэт літоўскага паэта А.Страздаса. Але гэтыя творы я не бачыў нават у рэпрадукцыях. З роду мастакоў Ромераў таксама паходзяць і дзеці Альфрэда Ромера (малодшага) — жывапісцы Павел Ромер, Ганна Ромер і Алена Ромер, але да высвятлення падрабязнасцей іх жыцця і творчасці мае рукі пакуль не дайшлі. Трэба пільна даследаваць шматлікія архівы, старыя часопісы і газеты, і, магчыма, музеі Літвы ды Польшчы.

Вяртаюся да нашага галоўнага героя — Альфрэда Ромера. Ён нарадзіўся ў Вільні, і там жа, ва ўніверсітэце, атрымаў пачатковую мастацкую адукацыю ў таго ж Кануція Русецкага. Потым удасканальваў сваё майстэрства ў Парыжы ў педагогаў "сярэдняй рукі" Л.Бана і А.Аляшчынскага. Па вяртанні з-за мяжы ў канцы 1850-х гадоў жыў у спадчынным маёнтку Крэўна Нова-Аляксандраўскага павета і актыўна супрацоўнічаў з віленскім часопісам "Каласы", дасылаючы туды малюнкі ды гравюры на тэму жыцця і побыту мясцовых беларусаў і літоўцаў. Здавалася, усё ішло вельмі паспяхова: мастак ні ў чым не адчуваў патрэбы, былі, як кажуць, здаровая ежа і багаты дом, спакой, цішыня, а галоўнае — моцнае жаданне тварыць у самых розных кірунках выяўленчага мастацтва.

Але ў час нацыянальна-вызваленчага руху 1863 г. А.Ромер апынуўся сярод паўстанцаў са зброяй у руках.

А.Ромер. "Мадонна Пінская".

Пасля паражэння быў арыштаваны і пасаджаны ў Дынабургскую крэпасць (цяпер — Даўгаўпілс). Праўда, прабыў там нядоўга: відаць, хтосьці з высокіх уладавых чыноў паклапаціўся пра інсургента. Пасля выхаду адтуль Ромеру давялося прадаць маёнтак Крэўна і тэрмінова, далей ад граху, выехаць у Германію. Там, у мюнхенскай Акадэміі мастацтваў, на яго аказалі значны ўплыў педагогі Людвіг фон Хагн і Артур Георг фон Рамберг. Разам з апошнім і Альбертам Келерам Альфрэд наведаў Італію, дзе натхнёна капіраваў Веранезэ і пісаў заказныя партрэты арыстакратаў і натурныя садова-паркавыя пейзажы. Шмат выстаўляўся ў Мюнхене, Кракаве, Парыжы — гравюрамі, партрэтамі, скульптурамі. І так доўжылася да сярэдзіны 1870-х гадоў, калі настальгія па радзіме прымусіла яго вярнуцца на Бацькаўшчыну.

Ромер стала пасяляецца ў маёнтку Каралінава, які належыў яго жонцы графіні Вандзе Сулістроўскай. На маю думку, гады, праведзеныя тут, на Беларусі, былі найбольш плённымі ў творчым лёсе мастака. Колькі ён зрабіў партрэтаў, гравюр, жывапісных кампазіцый пра жыццё і побыт беларускага народа, манументальных роспісаў у праваслаўных і каталіцкіх храмах у Камаях і Пінску — цяпер, мабыць, падлічыць немагчыма, бо не ўсё дайшло да нас у захаванасці. Падкрэслю, што менавіта ў Каралінаве Ромер падрыхтаваў манаграфію аб вытворчасці славутых слуцкіх паясоў, якая па фактычным матэрыяле, сабраным аўтарам у розных месцах Беларусі, уяўляе з сябе значную цікавасць для даследчыкаў нашага народнага і прыкладнога мастацтва. А якія бліскучыя акварэльныя і алоўкавыя этнаграфічныя замалёўкі сялянскага побыту і архітэктурных помнікаў ("Сялянская хата", "Сялянская дзяўчына", "Ля карчмы", "Сялянскі двор", "Мешчанін з Віленскай губерні", "Сялянкі з Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні", "Стары храм у Кабыльніках Свянцянскага павета", "Вішнева. Двор. Від з фасада", "Царква ў Камаях" ды іншыя)! А яшчэ Ромер быў заўзятым бібліяфілам: набываў дзе толькі магчыма старажытныя рукапісы і дакументы, якія потым перадаваў у музеі Кракава, куды пераехаў у 1884-м і дзе стаў членам "Камісіі гісторыі мастацтва Акадэміі навук". Менавіта там, за год да смерці, ён зрабіў памятны даклад "Да гісторыі Віленскай школы прыгожых мастацтваў" і надрукаваў работу "Польскія паясы. Іхнія фабрыкі і знакі".

Даследчыкі падлічылі, што Ромер за сваё жыццё стварыў 63 жывапісныя партрэты, 40 медальёнаў і 10 скульптур, некалькі дзясяткаў гравюр, пастэлей, малюнкаў, акварэлей і копій ікон. У свой час найбольш вядомымі былі партрэты археолага і кракаўскага педагога У.Лушчкевіча, бібліяфіла і гісторыка кнігі К.Эстрэйхера, скульптара Б.Яцунскага, жывапісца Швайніцкага. Цудоўны пагрудны светла-блакітны партрэт жонкі мастака — гордай графіні Ванды Сулістроўскай у простым сялянскім сарафане. Наогул кажучы, амаль усе партрэты Ромера простыя па кампазіцыі (як правіла, у фас альбо ў тры чвэрці) без усякіх вонкавых эфектаў і залішніх атрыбутаў і аксесуараў. Мастака больш за ўсё цікавіла псіхалогія мадэлі. Дакладней — няспешны, нязводны погляд тых, каго ён маляваў, бо толькі ў вачах мастак пасапраўднаму чытаў шчырасць і дабрасумленнасць характару чалавека. І ў бліскучым "Аўтапартрэце" ён выявіў сябе гордым і незалежным, напоўненым глыбокай унутранай спружыністай экспрэсіяй і сілай духу. Паводле мастацкага лаканізму і пранізлівасці гэты твор вытрымлівае параўнанне з узорамі вельмі высокай артыстычнасці.

Адным з найлепшых у яго творчасці з'яўляецца "Партрэт паўстанца 1863 года", зроблены сухой іголкай. На ім адлюстраваны ўжо даволі немалады беларускі шляхціч, былы інсургент—салдат знакамітага паўстання. З-пад навіслых сівых броваў проста на гледача пазіраюць цёмныя бліскучыя вочы. Энергічны паварот галавы, шчыльна сціснутыя вусны — усё кажа пра горды і нязломны характар гэтага чалавека. Хтосьці з даследчыкаў лічыць, што тут мастак выявіў вядомага паўстанца Фларыяна Даноўскага ў сталым узросце.

Ну, і, канешне ж, трэба адзначыць "духоўнае завяшчанне" мастака — карціну "Мадонна Пінская", якая ўпрыгожвае касцёл і кляштар францысканцаў у цэнтры Пінска паміж рэчкай Пінай і вуліцай Леніна. Карціна з'явілася там у 1894-м, за тры гады да смерці Ромера. Мураваны касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі пабудаваны ў першай трэці XVIII ст., пазней былі ўзведзены карпусы кляштара ў стыле барока. Тут шмат драўлянай скульптуры і дэкаратыўнай арнаментальнай барочнай разьбы. Карціна атрымала назву "Мадонна Пінская" таму, што правобразам яе паслужыла для мастака невядомая простая пінская гараджанка — звычайная жанчына з народу. Вось мы і бачым: пінчанка, якая ператварылася ў мадонну, у блакітнай накідцы з распушчанымі валасамі пад хусткай, беражліва трымае на руках дзіця. З нябёс ідзе яркі прамень святла і над галавой мадонны свеціцца ледзьве ўлоўны німб… Здаецца, нічога асабліва эфектнага ў традыцыйнай кампазіцыі, але колькі прывабнай лёгкасці, дабрыні і цеплыні выпраменьваюць гэтыя вочы, рукі, пастава, якая нас трымае і іншай чароўнасцю — выдатным жывапісным рамяством! Ромераўская ода ў гонар Мадонны — прачытана, лёс яе прадуманы і адчуты, але вока не адрываецца ад гэтага фарбавага поля, ад каштоўнай мешаніны, нанесенай пэндзлем, ад сонечнага мігцення, якое ідзе ад ліка Мадонны…

Менавіта гэтай работай Альфрэд Ромер скончыў сваю творчую біяграфію і, так здарылася, закрыў для сябе XIX стагоддзе. А свой апошні прытулак ён знайшоў у радзіннай капліцы ў літоўскім гарадку Трокі. Там, дарэчы, 12 лютага 1900 г. быў пахаваны і Эдуард Матэй Ромер, чыя спадчына, як і яго знакамітага брата, знаходзіцца сёння ў розных музеях Варшавы, Кракава, Вільнюса, Каўнаса і г. д. Мінска тут, на жаль, няма…

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 25 чэрвеня — да 2 ліпеня

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"И дольше века..."**. Да 27.06.2011.
■ Выстаўка аднаго шэдэўра. Іранскі тэбрызскі дыван.
■ Выстаўка графікі **"И прелести твоей секрет разгадке жизни равносилен..."**. Да 18.07.2011.
■ **"ТРОГАТельная выставка"**. Да 18.07.2011.
■ Выстаўка **"Італія, радзіма натхнення"**. Да 04.09.2011.
■ **"Класіка графікі"**.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

■ Выстаўка **"Таямніцы дрэва. Разьба па дрэве, чаканка"**.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Культура І-й пал. XIX ст."**.
■ Выстаўка работ навучэнцаў Магілёўскай ДШМ.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Старажытная Беларусь"**.
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
■ **"З крыніц адвечнай прыгажосці"**.
■ **"Водбліскі ваеннай славы"** (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).

Выстаўкі:
■ **"Экспануецца ўпершыню"**.
■ **"Дзе льецца Нёман срэбраводны..."**. Да 01.07.2011.
■ **"З узбекам песню адной мовай складалі аб вайне..."**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы"**.
■ Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
■ Музейная гульня **"У пошуках Папараць-кветкі"**.

экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўка:
■ **"Дзе льецца Нёман срэбраводны..."**. Да 01.07.2011.
■ **"З узбекам песню адной мовай складалі аб вайне..."**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
■ **"Пераможцы"**.
■ **"Вітражы партызанскай мудрасці і кемлівасці"**.
■ **"Дарогамі Перамогі. Бацька і сын Федарэнкі"**. Да 31.08.2011.
■ Фотавыстаўка Ларысы Салодкінай **"Творцы Перамогі"**.
■ **"Абаронцам Айчыны"**.
■ Выстаўка карцін у тэхніцы прасаванай фларыстыкі (ашыбана) мастачкі Анжалікі Чудзіевіч **"Натхненне"**.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокальны паверх паўднёвай галерэі).

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Экспазіцыя **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
■ Выстаўка кніг **"Мастацтва для вечнасці"**.
■ Выстаўка твораў Вольгі Капачовай **"Muchos bessos"**.

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:
■ **Пакой крывых люстэркаў**.
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні і аддзел па турызме (вул. Кірава, 8).

Гомельскі парк

Прыватная калекцыя галубоў **"Сімвал міру і любові"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.

Выставачная зала:
■ Падрыхтоўка новай выстаўкі.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ Персанальная выстаўка Мікалая Несцярэўскага.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ Выстаўка дыпломных прац дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4, пр.Леніна, 43. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыя:
■ **"Гаўрыла Вашчанка"**.
■ Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:
■ Выстаўка габеленаў Галіны Крываблоцкай. Да 03.07.2011.
■ Выстаўка алавяных салдацікаў і мадэлей караблёў А.Ляўкова.
■ Конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці памяці Станіслава Дзьяканава. Да 03.07.2011.
■ Праект **"Творчая лабараторыя"** на базе Чыгуначнага каледжа.

■ **"Ротмістр Вітольд Пілецкі. 1901 — 1948"**. Да 24.07.2011.

Дом-музей І З'езда РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя І З'езда РСДРП"**.
■ **"Казакі — абаронцы айчыны"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

■ Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўка:
■ Выстаўка **"Свет там думкі хітрыя знае..."** *(рэклама ў перыядычным друку пач. XX ст. у артэфактах эпохі)*.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
■ Выстаўка шаржаў Аляксандра Каршакевіча.
■ Выстаўка Святланы Дубялір **"Гульня фантазіі"**.
■ **"Свет шчодры. Свет мяне паўторыць..."** (да 80-годдзя з дня нараджэння У.Караткевіча).
■ **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"**.
■ **"Спадарожнікі дзяцінства"**.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Бурштын — золата Балтыкі"**.
■ Выстаўка **"Яркая палітра шасцідзясятых"**.
■ **"Прастора, напоўненая сэнсам"**.
■ Выстаўка Мікалая Батвінніка **"Тыя, што бягуць па лязу брытвы"**.
■ Выстаўка, прысвечаная Міжнароднаму дню абароны дзяцей **"Прастора дзяцей"**.
■ **"Жывіца. Часавыя прасторы"**.

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56. Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў

■ **25** — араторыя **"Жальбы"** (16.00); "Вечар балета ў замку Радзівілаў" (21.00);
■ **26** — Гала-канцэрт зорак Вялікага тэатра Беларусі (20.00).

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл.: 334 60 08.

■ **26** — **"Cerf voland/ Пралятаючы над..."**.
■ **29** — **"Шчаслівы муж"** Ф.Аляхновіча.
■ **30** — **"Інтымны дзённік (Дзённік паэта)"** С.Кавалёва.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

■ **26** — **"Шклянка вады"** У.Кандрусевіча.
■ **27** — **"Даратэя"** Ц.Хрэннікава.
■ **28** — **"Бабін бунт"** Я.Пцічкіна.
■ **29** — **"Вясёлая ўдава"** Ф.Легара.
■ **30** — **"Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава (11.30; 19.00).

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Галоўны рэдактар — Людміла Аляксееўна КРУШЫНСКАЯ
Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.
Рэдакцыя: Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).
Рэдактары аддзелаў: Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.
Спецкарэспандэнты: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 290-22-50 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23 Тэлефон/факс: (017) 334-57-35 Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.**
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 290-22-50. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2011.
Індэкс 63875 Наклад 8305 Падпісана ў свет 23.06.2011 у 18.30 Замова 2956 РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.
ISSN 1994-4780